

# ДБАЮЧЫ ПРА ІНТАРЭСЫ БЕЛАРУСІ

**Прэзідэнт правёў пасяджэнне Савета Бяспекі і сустрэчу з дэлегацыяй парламента Кеніі**

(Стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 СНЕЖНЯ 2025 г. СЕРАДА № 238 (30626)

# ДЭЛЕГАТ УНС — ГУЧЫЦЬ ГОДНА І АДКАЗНА




Трэцякурсніца Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта Лізавета Іванова — адзін з самых маладых дэлегатаў VII Усебеларускага народнага сходу. Цяперашнюю студэнтку ВДМУ заўважылі дзякуючы яе праектам і захапленню навукай. Яшчэ ў 10-м класе яна занялася даследаваннямі, за два гады напісала восем навуковых работ, адна з іх трапіла на рэспубліканскі этап маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі», дзякуючы якому дзяўчына ўлілася ў рады БРСМ. З навуковым кіраўніком Лізавета распрацавала сэнсарную пальчатку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. З дапамогай такой прылады і мабільнага дадатку можна «перакладаць» мову жэстаў. Сёння дзяўчына паспяхова вучыцца і працягвае сваю даследчыцкую дзейнасць.

Дэлегаты УНС — прадстаўнікі самых розных сфер дзейнасці, але іх аб'ядноўвае актыўная грамадзянская пазіцыя і праца на карысць грамадства. Хто яны, чым займаюцца ў жыцці — з некаторымі з іх знаёміць сёння спецвыпуск «Мясцовага самакіравання».

Працяг тэмы на стар. 7–9

Фота БелТА.

ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ АШУКАНЦАЎ



14

# ТРЭНІРОЎКА ПЕРАД ГАЛОЎНЫМ ІСПЫТАМ

**12 снежня стартуе рэгістрацыя на рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен**

І гэта першы званочак для выпускнікоў школ: час паступлення ўжо не за гарамі. Дата рэпетыцыйнага экзамену — 31 студзеня 2026 года, а пакуль школьнікі чакаюць рэгістрацыі на яго, якая пачнецца 12 снежня і працягнецца да 17 снежня. Удзел у рэпетыцыйным ЦЭ даступны для ўсіх выпускнікоў 11-х класаў, якія жадаюць праверыць свае веды.

СТАР. 12



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

25238

9 771990 763008



Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2026 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2026 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «НАШЫ ІНТАРЭСЫ ВЕЛЬМІ ПРОСТЫЯ. НАШЫХ ГРАНІЦ, УСЁ —

## Прэзідэнт сабраў Савет Бяспекі.

Традыцыйнае мерапрыемства, якое праводзіцца для вырашэння ключавых пытанняў умацавання бяспекі дзяржавы, адбылося ў Палацы Незалежнасці. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Савет Бяспекі Беларусі можа прыняць да рашэння і выканання любыя пытанні, але ўчора, сёння і ў будучыні асноўная ўвага гэтага органа скіравана на ваенную абарону і бяспеку.

Падчас пасяджэння Савета Бяспекі былі разгледжаны пытанні абароны і бяспекі нашай краіны на найбліжэйшы час, вынікі планавання абароны Беларусі на 2026–2030 гады. Асаблівую ўвагу прысвяцілі абстаноўцы, якая складваецца на нашай граніцы.

### «УЖО ПАЎСТАЕ ПЫТАННЕ: А ЯНЫ ДА ПСІХІЯТРА ХОДЗЯЦЬ ЦІ НЕ?»

Прэзідэнт папярэдзіў, што не стане глыбока ўнікаць у праблему мілітарызацыі заходніх краін, асабліва дзяржаў, якія гранічаць з Беларуссю. «Але мы не можам не бачыць гэту самую мабілізацыю і мілітарызацыю, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Польшча, Германія, іншыя дзяржавы, нават невялікія, з якімі мы гранічым, не толькі павялічваюць ваенныя свае бюджэты, але і спрабуюць павялічыць армію прыкладна ў два разы. Паўстае простае, зямное пытанне: калі хтосьці штосьці робіць, значыць, яму для нечага гэта трэба? І не стануць гэтыя краіны проста так траціць вялізныя грошы на, як яны кажуць, «супрацьстаянне Расіі і Беларусі».



Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз падкрэсліў, што Беларусь ні на каго не збіраецца нападаць.

**«Нам усяга дастаткова, — удакладніў ён. — Ведаю пазіцыю Расіі. Ну, трэба ж чымсьці абгрунтаваць (краінам, якія мілітарызуюцца. — «Зв.») гэтыя выдаткі ў той час, калі народ бяднее і закрываюцца радзільныя аддзяленні, бальніцы, калі на адукацыю не хапае грошай, калі жыллёва-камунальныя паслугі растуць непамерна (прыкладна ў пяць разоў выраслі), калі абразаюць электрычныя правады, па якіх ідзе электраэнергія танная».**

Па інфармацыі кіраўніка дзяржавы, даходзіць нават да таго, што ў некаторых краінах спрабуюць разабраць чыгуначныя шляхі, каб цалкам спыніць адносіны з Беларуссю і Расіяй. «Ужо паўстае пытанне: а яны да псіхіятра ходзяць ці не? — пацікавіўся Прэзідэнт. — Ну, калі вы не хочаце прыязджаць да нас па чыгунцы, ад нас не хочаце, каб людзі ехалі, няхай гэта чыгунка стаіць, яна ж нікому не перашкаджае. Не, трэба разабраць».

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка нагадаў падобную сітуацыю, якая адбылася на прасторы СНД, калі па загадзе былога прэзідэнта Узбекістана былі разабраныя чыгуначныя шляхі, якія вялі ў Таджыкістан, замест іх былі пасаджаны дрэвы. Ужо пры новым кіраўніцтве Узбекістана чыгуначныя зносіны з Таджыкістанам былі адноўлены.

### «НАМ ВАЙНА НЕ ПАТРЭБНА!»

Асобна Прэзідэнт спыніўся на пытанні «шарыкаў» (метэазондаў з цыгарэтамі), якія лятаюць ці то ў Літву, ці то з Літвы. За гэты час, па словах кіраўніка дзяржавы, пытанне прапрацавана сур'ёзна, з прыцягненнем пілотаў грамадзянскай авіяцыі.

«Тое, што сёння нам выстаўляюць літоўцы, гэта немагчыма, гэта нерэальна, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Нават калі б гэтыя шары, як яны гавораць, па 200 (цяпер ці то 20, ці то 50) туды залятаюць.

**Я размаўляў з лётчыкамі, пілотамі. Яны гавораць, што гэта ніякай праблемы не стварае. Праблему пачынаюць нагнятаць, палітызаваць. Навошта? Паўстае пытанне: няўжо паваяваць хочуць?»**

У чарговы раз Галоўнакамандуючы падкрэсліў, што вайна Беларусі не патрэбна. «Упэўнены, што і літоўскаму народу таксама вайна не патрэбна, як палякам, латышам і эстонцам, — удакладніў ён. — Навяваліся, хопіць ужо. Страцілі столькі людзей, яшчэ пакаленні жывыя, якія бачылі гэту вайну. Нам вайна не патрэбна!»

### «ХОЧАЦЕ НАРМАЛЬНЫХ АДНОСІН — ДАВАЙЦЕ ВЫБУДОЎВАЦЬ ГЭТЫЯ АДНОСІНЫ»

Закрануў Прэзідэнт і пытанне літоўскіх грузавікоў, якія засталіся на тэрыторыі нашай краіны пасля закрыцця Вільнюсам граніцы з Беларуссю. «Пачынаюць гвалтам крычаць наконт тых аўтамабіляў, якія валяліся на абочыне дарогі, калі літоўцы бок закрыў граніцу, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Але калі яны (аўтамабілі. — **«Зв.»**) валяюцца на абочыне дарогі, можа, у Літве гэта нармальна. Для нас гэта непрымальна».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што літоўскія аўтамабілі размешчаны на абсталяваных стаянках, якія ахоўваюцца. Акрамя таго, беларускі бок прапаноўвае выкупіць грузы, якія хутка псуюцца. Кіроўцы

# «МЫ АДКРЫТЫ ДЛЯ ВАШАЙ КРАІНЫ»

## Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу са спікерам Сената Кеніі

Беларусь працягвае ўмацоўваць супрацоўніцтва з Афрыкай. Візіт парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Кенія ў нашу краіну — чарговае таму пацвярджэнне. Мэта візіту кенійскіх парламентарыяў у Мінск — развіццё дыялогу дзвюх краін і пашырэнне ўзаемадзеяння па розных кірунках: ад эканомікі да гуманітарнай сферы.

### «ЁСЦЬ ПЛАН — БУДЗЕ ВЫНІК»

«Добра, што вы прыехалі, — вітаючы гасцей у Беларусі, пачаў сустрэчу кіраўнік дзяржавы. — Народная дыпламатыя на самым высокім узроўні мае вялікае значэнне. Я вельмі добра памятаю свой візіт у Кенію. Перадайце самыя добрыя пажаданні Прэзідэнту Кеніі. Як мне падалося, гэта вельмі добры і прыстойны чалавек».

Візіт беларускага лідара ў Кенію адбыўся ў снежні 2023 года. «Няхай гэта быў кароткі візіт, але я памятаю нават дэталі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, вельмі важна, каб кенійскія парламентарыі падчас свайго візіту ў нашу краіну, не спяшаючыся, пагледзелі на магчымасці Беларусі. «Калі нешта зможам для вас зрабіць, мы гатовы зрабіць, калі дамовімся. Я ўпэўнены, што дамовімся», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён акцэнтаваў увагу на тым, што Кенія — вельмі важная краіна. «Густанаселеная краіна на ўсходзе Афрыкі, — удакладніў беларускі лідар. — Гэта своеасаблівы фарпост для любой краіны пры ўваходзе на афрыканскі кантынент. Ваша краіна развітая, асабліва ў галіне сельскай гаспадаркі».

Беларусь гатова прапанаваць Кеніі адпаведныя тэхналогіі для таго, каб рухацца наперад. І размова не толькі пра тэхналогіі. «Пад гэтыя тэхналогіі мы маем усё неабходнае: і сельская гаспадарка, і людзі ў нас ёсць, кадры, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Ведаю, што людзей хапае ў Кеніі. Тым не менш, мы гатовы вам дапамагаць



у станаўленні новых кірункаў у сельскай гаспадарцы. Гатовы дапамагаць вам спецыялістамі, гатовы пастаўляць вам адпаведную тэхніку».

Ні для каго не сакрэт, у тым ліку для кенійцаў, што ў Беларусі на высокім узроўні развіта сельская гаспадарка, але найперш, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, Беларусь — краіна машынабудаўнічая.

«Мы вырабляем усю неабходную тэхніку, у якой вы маеце патрэбу, у тым ліку ў якой не маеце патрэбы сёння, але яна патрэбна вам будзе заўтра, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Думаю, у галіне машынабуда-

# ЯНЫ НЕ РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЦА ЗА МЕЖЫ УНУТРЫ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

## Якія актуальныя пытанні былі агучаны



аўтамабіляў забяспечаны гарачым харчаваннем, створаны ўмовы для іх камфортнага знаходжання на гэтых стаянках.

**«Усё робім для таго, каб было нармальна, — канстатаваў Прэзідэнт. — І пачынаюць (літоўскі бок. — «Зв.») мышкавацца, з-пад дывана або з-пад плінтуса высоўваюць галаву: «Аддайце нам гэтыя аўтамабілі». Калі ласка — бярыце. Але вярніце нам 17 або 20 аўтамабіляў, якія вы скралі. Пажарныя аўтамабілі, якія мы ў Зімбабвэ пастаўлялі. Нармалізуйце работу нашага санаторыя, дзе мы лячылі чарнобыльскіх дзяцей: яны ў дзяцей адабралі фактычна санаторый. І вярніце нам грошы за тое, што мы там будавалі порт».**

Беларускі лідар парэкамендаваў літоўскаму боку не крычаць «на дурніцу» і не шумець гвалтам. «Не трэба прыцягваць тут амерыканцаў, расіян або ўкраінцаў, — заўважыў ён.

**— Гэты нумар не пройдзе. Гэта тэма ляжыць у плоскасці нашых перагавораў і нашых пагадненняў. Хочаце нармальных адносін — давайце выбудоўваць гэтыя адносіны. Па ўсіх кірунках. Мы да гэтага гатовы. Спіхнуць на нас гэту праблему, перакінуць мяч на наш бок не атрымаецца».**

Па словах кіраўніка дзяржавы, больш за ўсё яго непакоіць, навошта літоўскі бок гэта робіць. «Сказаць, што яны дурні, — не скажаш, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Шмат разумных людзей думае над гэтым. Калі яны спрабуюць развязаць якісьці тут канфлікт, наўрад ці ў іх нешта атрымаецца. Мы з народам Літвы заўсёды дамовімся, як і з палякамі. Гэта нашы людзі. А калі хочаце нармальных адносін, садзіцеся за стол перагавораў і абмяркоўвайце гэтыя праблемы. Мы да гэтага гатовы. Іншых варыянтаў няма і наўрад ці будуць».

### «МЫ ГАТОВЫ АБАРАНЯЦЬ КОЖНЫ КАВАЛАК НАШАЙ ЗЯМЛІ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што больш-менш стабілізавалася сітуацыя на беларуска-ўкраінскай граніцы. «Хоць там праблем вышэй даху, — канстатаваў ён. — Учора мне наш галоўны пагранічнік (старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта. — **«Зв.»**) дакладваў аб тым, што шмат пытанняў, якія трэба будзе вырашаць у мабілізацыйным парадку: і выбудоўваць граніцу, якая кінутая, з боку Украіны, і будаваць заставы, і ўзбройваць пагранічнікаў».

Больш за тое, па словах Прэзідэнта, у другой лініі за пагранічнікамі даводзіцца выстаўляць Узброеныя Сілы, што адцягвае не толькі ўвагу, але і пэўныя сродкі.

«Мы бачым, што адбываецца вакол, і сёння нам трэба актуалізаваць не нашу абаронную, можа быць, дактрыну, а нашы абаронныя дзеянні для таго, каб усе бачылі, і перш за ўсё наш народ, што мы гатовы абараняць кожны кавалак нашай зямлі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі бок вітае перагаворы, якія вядуцца па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне. «Як бы тут не спрабавалі прынізіць ролю Трампа, ён малайчына ў гэтым плане, і ўчарашнія яго заявы міма народа не пройдуць, — адзначыў Прэзідэнт. — Ён хоча спыніць вайну, як ён гаворыць, для таго, каб не гінулі людзі. Можна вакол гэтага куралесіць і гаварыць што заўгодна, але што скажаш супраць таго, што робяць сёння амерыканцы? Аднак вы бачыце, якія сілы спрабуюць тарпедаваць. Нават амерыканскія прапановы спрабуюць тарпедаваць па мірным дагаворы з Украінай».

Па словах беларускага лідара, калі нават удасца ўстанавіць мір сення або заўтра ва Украіне, нам ад гэтага лягчэй не стане.

*(Працяг на 4-й стар.)*

вання, нафтаздабычы, нафтаперапрацоўкі, а таксама сельскай гаспадаркі мы маглі б знайсці агульную мову і развіваць наша супрацоўніцтва».

Беларускі лідар падкрэсліў, што Кенія — цудоўная краіна, ужо вядомая нам. У гэтай сувязі Прэзідэнт прапанаваў дзейнічаць больш актыўна, выпрацаваўшы адпаведны план.

«Мы накіравалі кенійскаму боку дарожную карту, — праінфармаваў ён. — Думаю, што нам трэба на аснове гэтай дарожнай карты распрацаваць адпаведны план нашых дзеянняў, актуалізаваць гэту дарожную карту з улікам патрэбнасцяў дзвюх дзяржаў. Калі ёсць план — ёсць адказныя людзі за рэалізацыю тых ці іншых пунктаў гэтага плана, кірункаў. Тады будзе вынік».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь вельмі зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Кеніяй. Ён адзначыў, што вопыт узаемадзеяння з краінамі Афрыканскага кантынента ў Беларусі ўжо ёсць, нядаўна да гэтага дадаўся Алжыр. «Вялізная краіна, якая з задавальненнем гатова з намі супрацоўнічаць, — адзначыў беларускі лідар. — І мы ўжо маем канкрэтныя напрацоўкі, канкрэтныя кантракты. Не толькі намеры, мемарандумы і гэтак далей, але ўжо канкрэтныя кантракты. Думаю, што з Кеніяй, раз ёсць добрыя прыклады, мы будзем супрацоўнічаць гэтак жа аператыўна і хутка, як з Зімбабвэ, Экватарыяльнай Гвінеяй, Нігерыяй, Алжырам, Егіптам і гэтак далей. Словам, мы адкрыты для вашай краіны».

### «ПАМІЖ НАШЫМІ КРАІНАМІ ІСНУЕ ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ»

**Спікер Сената Рэспублікі Кенія Амазон Джэфа КІНГІ** ад сябе асабіста, ад дэлегацыі, усяго кенійскага народа выказаў беларускаму лідару словы шчырай удзячнасці за цёплы прыём, аказаны нашым бокам. «Народ Беларусі вельмі дружалюбны, а восць надвор'е, на жаль, не», — звярнуў увагу спікер Сената Кеніі.

«Вам карысна для разнастайнасці, — з жартам адказаў Прэзідэнт. — Я толькі з вашага рэгіёна, зусім недалёка быў ад Кеніі. Там вельмі-вельмі сонечна, і мы сумавалі па гэтым (беларускім. — **«Зв.»**) надвор'і».

Амазон Джэфа Кінгі праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, што ў ходзе візіту кенійскіх парламентарыяў у Беларусь адбыліся плённыя перагаворы з іх калегамі-сенатарамі. «Мы абмяркоўвалі сферы двухбаковага ўзаемадзеяння, а таксама магчымасці для ўзаемадзеяння паміж парламентамі нашых краін, — канкрэтызаваў ён. — Я вельмі рады, што мы падпісалі Мемарандум аб узаемаразуменні, які дакладна акрэслівае тыя сферы ўзаемадзеяння, па якіх мы будзем рухацца далей».

Па словах спікера Сената Кеніі, разам з беларускімі парламентарыямі абмяркоўвалася супрацоўніцтва ў тых сферах, якія знаходзяцца і па-за межамі народнай дыпламатыі. «Паміж нашымі краінамі існуе вялікі патэнцыял і мноства магчымасцяў для супрацоўніцтва», — адзначыў кіраўнік Сената Кеніі.

## Даслоўна

У размове з журналістамі спікер Сената Кеніі Амазон Джэфа Кінгі прызнаўся, што сустрэча з кіраўніком беларускай дзяржавы — вялікі гонар і ўнікальная магчымасць перадаць самыя лепшыя і цёплыя пажаданні ад Прэзідэнта Кеніі Уільяма Рута. Спікер Сената Кеніі нагадаў, што ў 2023 годзе Прэзідэнт Беларусі наведаў Рэспубліку Кенію, дзе адбылася прадуктыўная сустрэча паміж лідарамі дзяржаў. «Тады бакі дамовіліся распрацаваць дарожную карту супрацоўніцтва ў розных сектарах эканомікі, — канкрэтызаваў Амазон Джэфа Кінгі. — І падчас сённяшняй сустрэчы я пацвердзіў жаданне Прэзідэнта Кеніі наведаць Беларусь з мэтай падпісання пагаднення аб узаемадзеянні паміж нашымі краінамі ў сферы эканомікі і іншых галінах».

Амазон Джэфа Кінгі падкрэсліў, што Кенія — сельскагаспадарчая краіна, а Беларусь вырабляе самыя лепшыя трактары ў свеце. «Таму, вядома ж, падчас сённяшняй сустрэчы мы абмяркоўвалі магчымасці ўзаемадзеяння ў сельскагаспадарчай сферы і пытанні магчымых паставак беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі ў Кенію. Мы таксама абмеркавалі супрацоўніцтва і ў іншых галінах, перш за ўсё ў сферы высокіх тэхналогій, адукацыі і турызму», — дадаў ён.

Сярод пытанняў, якія ўздымаліся падчас сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы, спікер Сената Кеніі адзначыў прамыя авіязносіны паміж нашымі краінамі. Паводле яго слоў, гэта, безумоўна, аблегчыла б узаемадзеянне паміж дзелавымі коламі Беларусі і Кеніі. «У ходзе сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы мы працягнулі абмяркоўваць тыя тэмы, той дыялог, які быў пачаты ў ходзе візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Найробі ў снежні 2023 года», — акцэнтаваў увагу Амазон Джэфа Кінгі.

Паводле слоў кенійскага госця, падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі дапамагло б перш за ўсё вызначыць кірункі для ўзаемадзеяння, а таксама распрацаваць дэталёвы, паэтапны план работы нашых краін. «Я ўпэўнены, што візіт Прэзідэнта Кеніі ў Беларусь у наступным годзе дазволіць падпісаць такое пагадненне. З вызначэннем плана нашых далейшых дзеянняў узаемадзеянне паміж краінамі пойдзе значна хутчэй», — рэзюмаваў Амазон Джэфа Кінгі.

**Вераніка КАНЮТА, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ. Фота БелТА.**

# «НАШЫ ІНТАРЭСЫ ВЕЛЬМІ ПРОСТЫЯ. ЯНЫ НЕ РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЦА ЗА МЕЖЫ НАШЫХ ГРАНІЦ, УСЁ — УНУТРЫ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)*

**«Нас будуць душыць і далей, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — І асабліва гэтыя дзяржавы (не хачу іх абражаць, каб не пакрыўдзіўся народ), якія ў нас на поўначы і на паўночным захадзе. Яны ад нас чагосьці патрабуюць. А калі б мы ў Беларусі стваралі альтэрнатыўныя ўрады і падтрымлівалі «байцоў за незалежнасць»? Яны там ствараюць баявыя атрады, яны іх узбройваюць (памятаеце «харугвы», яны нікуды не дзеліся). І цэлыя палкі, як яны іх называюць. Гэта што — жарты? І яны яшчэ да нас пэўныя прэтэнзіі прад'яўляюць. Ну, утрымліваюць яны іх, няхай утрымліваюць, калі ў іх ёсць грошы. Але калі гэта накіравана супраць нашай краіны, то як мы павінны на гэта рэагаваць?»**



## «КАЛІ КРЫХУ ЯКАСЦЬ ПАДЦЯГНЕМ, НАМ КАНКУРЭНТАЎ НЕ БУДЗЕ»

Кіраўнік дзяржавы ў чарговы раз падкрэсліў: Беларусь не хоча вайны. «Мы ніколі не лічым сваім праціўнікам або сапернікам, — удакладніў ён. — Тым не менш мы рыхтуемся да гэтай вайны, каб яе не было. Тысячу разоў пра гэта сказана, і вы аб гэтым адкрыта і рашуча заяўлялі. Нашы інтарэсы вельмі простыя. Яны не распаўсюджваюцца за межы нашых граніц, усё — унутры нашай дзяржавы. І калі мы кудысьці едзем, з кімсьці вядзём перагаворы, то гэта не накіравана супраць трэціх краін».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт прывёў у прыклад сваю нядаўнюю вялікую камандзіроўку ў Азію, Афрыку, на Блізкі Усход, падчас якой нідзе не вяліся перагаворы супраць трэціх краін. «Мы вядзём перагаворы са сваімі партнёрамі ў Алжыры або ў Амане, або ў М'яньме, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Яны душаць гэтыя краіны, а мы ідзём да іх з працягнутай рукой. Дзяржавы, людзі, улады гэта цудоўна разумеюць і гатовы з намі выбудоўваць добрыя адносіны».

Беларусь гатова ўзаемадзейнічаць і са сваімі суседзямі, якія на гэтым этапе праводзяць у дачыненні да нас недружалюбную палітыку. «Яны выбралі гэты шлях і думаюць, што прыедуць тут амерыканцы, на мяне націснуць, або яшчэ нейкія еўрапейцы, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Слухайце, мы поўнасцю перастроіліся. І калі мы будзем рухацца, больш актыўна будзем працаваць у эканоміцы, пачынаючы з Віцебскай вобласці і заканчваючы Гомельскай, у нас увогуле не будзе праблем».

Па словах беларускага лідара, нас чакаюць у многіх кутках планеты. «З нашымі тэхналогіямі, нашымі таварамі, — удакладніў ён. — Таму, калі крыху якасць падцягнем (хоць нам ніхто не выказвае прэтэнзій па якасці, але ўсё роўна нам трэба працаваць), нам канкурэнтаў не будзе. Мы не каланіялісты. Мы ў тую ж Афрыку ідзём для таго, каб дапамагчы ім тэхналогіямі. Пад гэтыя тэхналогіі ў нас ёсць тэхніка адпаведная. Мы машынабудаўнічая краіна, у нас развітая сельская гаспадарка. У той жа Кеніі сёння гатовы распрацоўваць радовішча нафты. Мы гатовы падключыцца. У нас ёсць спецыялісты, якія ўмеюць гэта рабіць. Таму мы з дабром заўсёды ідзём, яшчэ раз падкрэсліваю, не гаворачы ўжо пра нашых суседзяў».

Прэзідэнт заўважыў: што Літве перашкаджала супрацоўнічаць з Беларуссю? «Мы загружалі іх порт: 30 % бюджэту фарміравалася ў Літве як мінімум за кошт патоку нашых грузаў, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Чаго яшчэ не хапала? Чаго ашалелі?»

Таму, па словах Галоўнакамандуючага, абарона і бяспека нашай краіны разглядаецца сёння як найважнейшы кірунак. «Таму было пастаўлена пытанне аб вяртанні нам ядзернай зброі, што мы і зрабілі, аб размяшчэнні на баявое дзяжурства самых сучасных комплексаў расійскай вытворчасці, — дадаў Прэзідэнт. — Мы маем поўнае разуменне і падтрымку ад Расіі. Разам і будзем імкнуцца абараняць нашу краіну. Мы ні на каго не збіраемся нападаць. Гэта не наша тэма. Хопіць, наваяваліся. Мы, мужыкі, павінны абараніць сваю краіну і абараніць тое, што належыць, можа, ужо не нам, а нашым дзецям».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

## Даслоўна

## «ЁСЦЬ УПЭЎНЕНАСЦЬ У ТЫМ, ШТО МЫ ЗАХАВАЕМ МІР»



У размове з журналістамі **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі Павел МУРАВЕЙКА** падкрэсліў, што ў ходзе пасяджэння Савета Бяспекі былі разгледжаны вынікі фактычна гадавой работы Генеральнага штаба, Міністэрства абароны, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання па планаванні абароны краіны на чарговыя пяць гадоў. «Улічваючы тыя падыходы, якія закладзены ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, Ваенную дактрыну, зацверджаную Усебеларускім народным сходам, яны былі рэалізаваны ў дакументах плана абароны, — канкрэтызаваў Павел Муравейка. — Прэзідэнт прадметна азнаёміўся з іх зместам, з аспектамі адносна таго, як будзе ажыццяўляцца супрацьдзеянне пагрозам, што ўзнікаюць вакол нашай краіны, як будзе ажыццяўляцца стрымліванне ваенных канфліктаў, да чаго мы гатовыя па адбіцці агрэсіі і якія дзеянні робім для таго, каб на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь былі мір і бяспека.

Паводле яго слоў, абстаноўка вакол Беларусі сёння яшчэ больш складаная, чым напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. «Калі параўноўваць з чэрвенем 1941 года, то, напэўна, цяпер абстаноўка яшчэ больш складаная, таму што краіны нашмат выраслі эканамічна, інтэлектуальна, стала больш дасканалым узбраенне і ваенная тэхніка, — лічыць начальнік Генеральнага штаба. — Сёння тыя фактары, якія ўплывалі на абстаноўку вайны ў 1941-м, не з'яўляюцца дамінуючымі. Сёння пераважаюць узаемныя незразумелыя прэтэнзіі, праводзіцца санкцыйная палітыка, якая ні да чаго добрага ў найбліжэйшай перспектыве не прывядзе. Захад фактычна рыхтуецца да вайны, таму гучыць рэваншысцкая накіраванасць у рыторыцы заходніх палітыкаў. Актыўна праводзяцца мерапрыемствы па ўдасканаленні і развіцці Узброеных Сіл, закупліецца сучаснае ўзбраенне і гэтак далей».

Павел Муравейка выказаў упэўненасць, што рашэнне гэтага працэсу ёсць. «І пра гэта шмат разоў гаварыў наш кіраўнік дзяржавы, — заўважыў начальнік Генеральнага штаба. — Трэба садзіцца за стол перагавораў і дамаўляцца. Пакуль, на жаль, розум у Еўропе не пераважае. Будзем спадзявацца, што наша пазіцыя ў хуткай будучыні знойдзе свой водгук, і краіны сядуць за стол перагавораў і пачнуць памяншаць тую агрэсіўную рыторыку, тыя агрэсіўныя дзеянні, якія адбываюцца цяпер».

Адказваючы на ўдакладняючае пытанне, ці ёсць усё ж такі ў беларускіх ваенных надзея на мір, Павел Муравейка падкрэсліў: «У нас не надзея на мір, а ўпэўненасць у тым, што мы захаваем гэты мір. І ў тым, што здаровы сэнс і голас нашай краіны і разумных краін, якія адстойваюць мір, будзе гучаць значна гучней, чым голас тых, хто хоча вайны».

Што датычыцца наяўнасці ў Беларусі ядзернай зброі і планаў па размяшчэнні ракетнага комплексу «Арэшнік», начальнік Генштаба адзначыў, што гэта ў першую чаргу фактары стрымлівання. «Падобныя віды ўзбраенняў маюць вялікую разбуральную сілу. І перш чым здзейсніць напад на нашу краіну, кожны задумаецца, якім можа быць адказ. Ёсць у ваеннай гісторыі такое выказванне, як «піррава перамога» (дасягнутая такой цаной, што яна становіцца раўнасільнай паражэнню. — **«Зв.»**). Гэта значыць, перамагчы можна. Пытанне, з чым ты застанешся потым. Таму наяўнасць гэтага патэнцыялу з'яўляецца ў пэўнай ступені стрымліваючым фактарам ад магчымых агрэсіўных памкненняў супраць нашай краіны», — заявіў Павел Муравейка.

Начальнік Генштаба асобна акцэнтаваў: «Кіраўнік дзяржавы разгледзеў і адобрыў усе дакументы, падпісаў план дзейнасці нашай краіны па забеспячэнні ваеннай бяспекі і абароне. Рыхтуецца да падпісання ўказ аб зацвярджэнні плана абароны ў цэлым».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ФОРУМ МАЛАДЫХ ПАТРЫЁТАЎ

## Пленарнае пасяджэнне першага Маладзёжнага ваенна-патрыятычнага форуму прайшло ў Мінску

Як сфарміраваць у падрастаючага пакалення базавыя духоўна-маральныя арыенціры, выхаваць павагу да дзяржаўнай сімволікі, падтрымаць у моладзі актыўную грамадзянскую пазіцыю — больш за трыста маладых людзей з усёй краіны сабраліся абмеркаваць гэтыя і іншыя пытанні, каб вызначыць, што значыць быць патрыётам сёння.

### ШЧЫТ БУДУЧЫНІ І СУВЕРЭНІТЭТУ ДЗЯРЖАВЫ

Гісторыя не раз даказвала: народ, у чыіх сэрцах жыве любоў да Радзімы, здольны пераадолець любыя выпрабаванні. Гэта, звяртаючыся да прысутных, адзначыла і **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**: «Сімвалічна, што наш форум праходзіць у год 80-годдзя Вялікай Перамогі — падзеі, якая вызначыла лёс нашай краіны і ўсяго чалавецтва. Перамогі, якая была здабытая велізарнай цаной і засталася для нас маральным арыенцірам, сімвалам нязломнай волі і бязмернай любові да сваёй Айчыны. Вы — спадчыннікі пакалення пераможцаў, праўнукі партызан, салдат, падпольшчыкаў, людзей, для якіх гонар і абавязак былі не простымі словамі, а сэнсам жыцця».

У нашы дні, калі інфармацыйныя і гібрыдныя войны працягваюць расхістваць асновы беларускага грамадства і маніпуляваць свядомасцю моладзі, як ніколі важна прыкладаць усе намаганні для яе патрыятычнага выхавання. Бо, як падкрэсліла Наталля Качанава, праўду немагчыма перапісаць там, дзе прадстаўнікі маладога пакалення шануюць памяць аб подзвігу савецкага салдата і захоўваюць дух пераможцаў: «Ваша цвёрдая грамадзянская пазіцыя, беражлівыя адносіны да гістарычнай спадчыны, да памяці герояў, якія сталі сімвалам нязломнай мужнасці і падарылі нам мірнае жыццё, — гэта надзейны шчыт будучыні нашай краіны і суверэнітэту дзяржавы».

Такога ж меркавання прытрымліваецца і **курсант першага курса Інстытута пагранічнай службы, удзельніца праекта «Цягнік памяці» ў 2024 годзе Наталля МІКША**. Дзяўчына добраахвотна змяніла звычайнае жыццё на форму, статут і цяжкі, але ганаровы шлях абаронцы Айчыны. Наталля гаварыла ад самой моладзі, аб тым, што яна ўжо робіць і гатова рабіць у будучым на карысць дзяржавы: «Я лічу, што самае галоўнае — гэта шчыра любіць сваю адзіную і непаўторную Радзіму, быць карысным ёй і сваім суграмадзянам. Быць патрыётам — гэта значыць дзейнічаць. І я ўпэўнена, што мой шлях — гэта толькі адзін з тысяч магчымых варыянтаў служэння сваёй краіне».



### ЗАМАТЫВАВАЦЬ І ЗАЦІКАВІЦЬ МОЛАДЗЬ

Ваенна-патрыятычнае выхаванне — неад'емная частка станаўлення грамадзяніна і асобы, для якога ў нашай краіне створаны ўсе неабходныя ўмовы. Як адзначыў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**, у беларускіх школах паспяхова працуюць спецыялізаваныя ваенна-патрыятычныя класы. Тое, што з кожным годам іх колькасць толькі павялічваецца, — прамы доказ іх запатрабаванасці і эфектыўнасці. Да таго ж, за кожнай школай замацаваны памятныя мясціны, мемарыялы і іншыя гістарычныя аб'екты. Асаблівую ролю ў агульнай сістэме ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі займаюць і ваенна-патрыятычныя клубы.

Дарэчы, у сістэме Міністэрства ўнутраных спраў функцыянуе 207 ваенна-патрыятычных клубаў. І сетка, паводле слоў **намесніка міністра ўнутраных спраў — камандуючага ўнутранымі войскамі Мікалая КАРПЯНКОВА**, працягвае развівацца і пашырацца. Асаблівая ўвага ўдзяляецца ўзаемадзеянню з унутранымі войскамі, на базе якіх працуюць ужо 23 спецыялізаваныя клубы. Таму і месцам правядзення першага Маладзёжнага ваенна-патрыятычнага форуму выбралі воінскую часць 3214 не проста так. «Мы рыхтуем моцную, прафесійную моладзь, якая любіць сваю Радзіму, ганарыцца ёю. І, што самае галоўнае, разумее, што Радзіму трэба абараняць, — адзначыў Мікалай Карпянкоў. — Для форуму мы пастараліся зрабіць цікавыя лакацыі, каб максімальна матываваць моладзь пайсці служыць у падраздзяленні спецыяльнага прызначэння, стаць афіцэрамі». Паказальныя выступленні і знаёмства з работай спецпадраздзяленняў таксама пакінулі ўдзельнікам форуму па-сапраўднаму незабыўныя ўражанні.

Але важна разумець: задача клубаў не зводзіцца выключна да падрыхтоўкі будучых вайскоўцаў — патрыёты патрэбны ва ўсіх сферах жыцця дзяржавы і грамадства. Увогуле, сёння мы жывём у імклівы час, калі менавіта ад моладзі залежыць, якім будзе заўтра. «Вашы ідэі, імкненні, энергія і полымя любові да Радзімы здольныя мяняць усё навокал, рабіць лепшым, — адзначыў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**. Міністр пажадаў, каб Маладзёжны ваенна-патрыятычны форум стаў не толькі пляцоўкай для абмену вопытам, умацавання сяброўскіх адносін і пашырэння кругагляду, але і адпраўным пунктам для самых смелых ідэй і вялікіх здзяйсненняў.

**Аміна НАЗАРАВА, фота аўтара.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ПРАМЫСЛОВАЯ ПАЛІТЫКА, ТЭХНАЛАГІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ, ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА...

## На чым зробяць акцэнт заканадаўцы Саюзнай дзяржавы ў найбліжэйшыя гады




У Маскве 9 снежня прайшла 69-я сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. У цэнтры ўвагі саюзных парламентарыяў былі асноўныя пытанні функцыянавання аб'яднання, уключаючы выкананне бюджэту ў 2025 годзе, прыняцце аналагічнага дакумента на 2026 год і многае іншае.

Падчас сесіі першы намеснік старшыні Парламенцкага сходу, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЕЯНКА** канстатаваў, што інтэграцыйныя праграмы, разлічаныя на 2024—2026 гады, выкананы на 40 %. «Пачата работа па распрацоўцы плана мерапрыемстваў на новы трохгадовы перыяд — 2027—2029 гады. Акцэнт будзе зроблены на такія кірункі, як прамысловая палітыка, тэхналагічны суверэнітэт, харчовая бяспека, транспарт, энергетыка, турызм. І нам трэба аператыўна далучыцца да гэтай работы», — сказаў ён.

Паводле слоў спікера, ужо даўно наспела неабходнасць удзяляць больш увагі рэалізацыі дарожных карт па супрацоўніцтве ў сферах мікраэлектронікі, станкабудавання, авія- і ліфтабудавання. Мерапрыемствы профільных камісій непасрэдна на месцах і кантакты з кіраўніцтвам рэгіёнаў Беларусі і Расіі таксама павінны насіць практыка-арыентаваны характар.

Ігар Сергеенка нагадаў, што ў 2025 годзе быў прыняты шэраг запатрабаваных грамадзянамі дзвюх краін мер па забеспячэнні роўнасці правоў у сферах адукацыі, медыцыны, працоўнай дзейнасці, падтрымкі старэйшага пакалення, прыгранічных транспартных зносін. «Так, паспяхова рэалізавана ініцыятыва аб стварэнні адзінай сістэмы абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці аўтаўладальнікаў транспартных сродкаў Саюзнай дзяржавы, і ўжо заключана каля 70 тысяч дагавораў. Але ёсць над чым працаваць. У прыватнасці, гаворка ідзе аб гарманізацыі заканадаўства аб выканаўчай вытворчасці», — канстатаваў спікер.

У цэлым жа ў плане забеспячэння роўнасці правоў грамадзян бакі ўжо змаглі дасягнуць пэўных вынікаў, звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. «Але, як справядліва адзначаюць многія дэпутаты, інфармаванасць нашых выбаршчыкаў аб новых магчымасцях, якія для іх адкрываюцца, вымушае жадаць лепшага, — падкрэсліў спікер. — Мы разумеем, што ва ўмовах гібрыднай вайны недахоп дакладнай інфармацыі — гэта пажыўнае асяроддзе для ўзнікнення ўсякага роду спекуляцый на саюзнай тэматыцы і правакавання грамадскай незадаволенасці. Парламентарыі павінны праводзіць больш наступальную інфармацыйную палітыку ў гэтым плане».

Пытанні абароны саюзных граніц, паводле слоў спікера, таксама заўсёды былі ў цэнтры ўвагі Парламенцкага сходу. «І сёння задачы, звязаныя з рэалізацыяй канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы, праграм ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, мадэрнізацыі і тылавога забеспячэння, развіцця пагранічнай бяспекі, застаюцца адным з нашых галоўных прыярытэтаў, — канкрэтызаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Аднак падтрыманне і нарошчванне абароннай магутнасці наўпрост залежыць ад таго, наколькі моцнай, самадастатковай і ўстойлівай да вонкавых пагроз будзе эканоміка Беларусі і Расіі, Саюзнай дзяржавы ў цэлым».

Як паведаміў па выніках сесіі **старшыня Парламенцкага сходу, спікер Дзяржаўнай Думы Расіі Вячаслаў ВАЛОДЗІН**, форум Саюзнай дзяржавы па абароне гістарычнай памяці плануюць правесці ў 2026 годзе ў Брэсце. «Нашы беларускія калегі прапанавалі правесці форум па абароне і захаванні гістарычнай памяці ў будучым годзе ў Брэсце. Мы прынялі гэтае запрашэнне і са свайго боку пастараемся зрабіць усё, каб у нас гэта былі не толькі заявы, размовы і рашэнні, але нам вельмі важна, каб мы зрабілі ўсё для адначэння справядлівасці аб памяці тых, каго няма з намі», — падкрэсліў ён.

Форум у Брэсце стане працягам міжнароднага форуму Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня», які адбыўся вясной 2025 у Валгаградзе, з удзелам прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна.

Яшчэ адным важным пунктам сесіі стала адабрэнне бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2026 год адразу ў двух чытаннях. Прадстаўляючы бюджэт да зацвярджэння, дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Сяргей Глазьеў расказаў аб яго ключавых параметрах: даходы — 8 млрд 65,9 млн расійскіх рублёў, выдаткі — 6 млрд 308,3 млн, прафіцыт — 1 млрд 757,6 млн. Даходная частка сфарміравана за кошт штогадовых узгодненых адлічэнняў дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, а таксама рэштак сродкаў бюджэту мінулых гадоў, якія склалі 645,7 млн расійскіх рублёў.

У структуры расходаў бюджэту 71 % выдаткаў прадугледжана на фінансаванне праграм, праектаў і мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы — 4,5 млрд расійскіх рублёў. Запланавана фінансаванне шасці зацверджаных праграм Саюзнай дзяржавы ў галіне касмічнай тэхнікі, пагранічнай бяспекі, абароны інфармацыйных рэсурсаў і г. д. Прыняты Парламенцкім сходам бюджэт СД на 2026 год павінен быць зацверджаны Вышэйшым дзяржсаветам Саюзнай дзяржавы.

Таксама на сесіі намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Уладзіслаў Татарыновіч быў выбраны намеснікам старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Упраўлення прэс-службы і інфармацыі Дзяржаўнай Думы РФ.**

# У СТЫЛІ ЭЛЕКТРА

## Першыя электробусы выйдуць на прыгарадныя маршруты ў Беларусі ў 2026 годзе



Электратранспарт будзе курсіраваць паміж Мінскам і гарадамі-спадарожнікамі.

Як паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый, машыны з запасам ходу ў 100 км цяпер праходзяць выпрабаванні.

Па словах **намесніка генеральнага дырэктара па інавацыйным развіцці холдынгу «Белкамунмаш» Алега БЫЦКО**, на наступны год прадпрыемства плануе мадэрнізаваць гэты электробус, пашырыць яго аўтаномны ход да 250 км і забяспечыць магчымасць экспрэс-зарадкі:

— Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача забяспечыць менавіта прыгарадныя перавозкі электратранспартам. Таму мы актыўна ўдзельнічаем у гэтым працэсе, і ў наступным годзе абавязкова такі электробус ужо будзе перавозіць пасажыраў паміж Мінскам і Смалявічамі. І ўсе астатнія гарады-спадарожнікі плануецца абсталяваць такім транспартам.

Як растлумачылі ў профільным міністэрстве, электробусы спраектаваны з папраўкай на ўмовы прыгарада: у іх устаноўлены сядзенні павышанай камфортнасці з рамянямі бяспекі, таксама ўлічаны асаблівыя патрабаванні да трываласці кузава.

# НА ЗДАРОЎЕ!

## Беларускія фармпрадпрыемствы прымаюць удзел у «Расійскім тыдні аховы здароўя»

Беларуская экспазіцыя з удзелам флагманаў айчыннай фармацэўтычнай галіны і сферы вытворчасці вырабаў медыцынскага прызначэння прадстаўлена ў рамках спецыялізаванага міжнароднага форуму «Расійскі тыдзень аховы здароўя — 2025», які праходзіць у Маскве з 8 да 11 снежня.



Як нагадалі ў Беларускай гандлёва-прамысловай палаце, форум з'яўляецца адным з асноўных кангрэсна-выставачных мерапрыемстваў Расіі ў галіне медыцыны і галоўнай пляцоўкай для дэманстрацыі інавацый у ахове здароўя. Міжнародны навукова-практычны форум «Расійскі тыдзень аховы здароўя» праводзіцца з 1974-га штогод і з'яўляецца самым маштабным комплексным праектам у галіне медыцыны, аховы здароўя, уключаючы вытворчасць абсталявання, навуку і практычную медыцыну ў СНД.

Сёлетняе мерапрыемства аб'ядноўвае больш за 27 тысяч спецыялістаў, экспертаў і лідараў галіны. На пляцоўцы «Расійскага тыдня аховы здароўя» прадстаўлена больш за тысячу кампаній з 10 краін — Беларусі, Індыі, Ірана, Казахстана, Кітая, Карэі, Лівана, Расіі, Турцыі і Узбекістана.

Удзельнікі дэманструюць медыцынскія вырабы і абсталяванне, інавацыйныя медыцынскія і рэабілітацыйныя тэхналогіі, сэрвісныя рашэнні, найлепшыя практыкі арганізацыі аховы здароўя, экспарту медыцынскіх паслуг і санаторна-курортнай галіны.

На пляцоўцы форуму праходзяць тэматычныя падзеі: міжнародныя выстаўкі «Ахова здароўя», «Здаровы лад жыцця», «MedTravelExpo. Санаторый. Курорт. Медыцынскія цэнтры», а таксама экспа «ФармМедПрам».

У рамках выставачнай часткі экспазіцыя нашай краіны прадстаўлена кампаніямі найбуйнейшага галіновага холдынгу «Белфармпрам», сярод якіх «Белмедпрэпараты», Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў, «Мінскінтэркапс», «ФрэБор», а таксама лідара ў вытворчасці антысептычных і дэзынфікуючых сродкаў — прадпрыемства «Беласептыка».

Дарэчы, беларускія прадпрыемствы дэманструюць шырокую вытворчую лінейку лекавых сродкаў, вырабаў медыцынскага прызначэння і спецыялізаванай прадукцыі.

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ПА НАРАСТАЮЧАЙ

## Біржавы тавараабарот Брэсцкай вобласці з Кітаем вырас больш чым у тры разы

За 11 месяцаў гэтага года сума біржавых здзелак паміж прадпрыемствамі Брэсцкай вобласці і суб'ектамі гаспадарання Кітайскай Народнай Рэспублікі дасягнула 7 мільёнаў долараў. Гэта ў 3,3 раза больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, паведамілі ў прэс-службе БУТБ.

У структуры ўзаемнага тавараабароту пераважаў экспарт тавараў, выробленых у Брэсцкай вобласці. Яго доля ў агульным аб'ёме біржавых здзелак з удзелам брэсцкіх і кітайскіх кампаній склала 76 % у вартасным выражэнні.

Такой статыстыкай падзяліўся **кіраўнік прадстаўніцтва Беларускай універсальнай таварнай біржы ў Шанхаі Аляксей ДЫКУША** падчас сустрэчы з афіцыйнай дэлегацыяй Брэсцкай вобласці на чале з губернатарам рэгіёна Пятром Пархомчыкам. На мерапрыемстве таксама прысутнічаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы Аляксандр Чарвякоў.

— Экспарт брэсцкіх тавараў у Кітай у параўнанні з мінулым годам павялічыўся ў 3,3 раза, да 5,3 мільёна долараў. Асноўнымі драйверамі росту сталі продажы мясных паўфабрыкатаў з ялавічыны, піламатэрыялаў іглічных парод, сладкасметанковага алею і сухога абястлушчанага малака. Акрамя таго, у невялікіх аб'ёмах ажыццяўляліся пастаўкі лому чорных металаў. Што датычыцца імпарту з Кітая, то прадпрыемствы Брэсцкай вобласці выкарыстоўвалі біржавы механізм галоўным чынам для закупкі харчовай сыравіны. Па гэтым паказчыку тэмп росту да мінулага года склаў 340 %, — расказаў кіраўнік прадстаўніцтва БУТБ у Шанхаі.

Па выніках візіту дэлегацыі Брэсцкай вобласці ў Шанхайскі офіс БУТБ дасягнута дамоўленасць аб актывізацыі ўдзелу брэсцкіх таваравытворцаў у біржавых таргах з мэтай рэалізацыі і набыцця тавараў на рынку КНР.

Па даных біржы, у бягучым годзе на рэгулярнай аснове біржавыя здзелкі з кітайскімі кампаніямі заключалі 15 суб'ектаў гаспадарання Брэсцкай вобласці — як дзяржаўнай, так і прыватнай формы ўласнасці. У сувязі з гэтым асаблівую ўвагу плануецца ўдзяліць пашырэнню пула такіх удзельнікаў. Пры гэтым прадстаўніцтва БУТБ у Шанхаі выказала гатоўнасць аказваць садзейнічанне прадпрыемствам Брэсцкай вобласці ў пошуку контрагентаў на тэрыторыі Кітая, арыентуючыся на інфармацыю, указаную ў заяўках на продаж або куплю.

# УЗОРНАЯ МАДЭЛЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## У Тэгеране абмеркавалі перазагрузку інвестыцыйнага супрацоўніцтва Беларусі і Ірана

Днямі ў сталіцы Ірана адбылося 18-е пасяджэнне змешанай беларуска-іранскай міжурадавай камісіі па пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва, паведамілі ў прэс-службе Мінпрама.



Пасяджэнне правялі сустаршыні з абодвух бакоў — **міністр прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ** і міністр прамысловасці, шахт і гандлю Ірана Сеед Махамад Атабак.

У пасяджэнні таксама ўдзельнічалі Пасол Беларусі ў Іране Дзмітрый Кальцоў, прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання і прадпрыемстваў галіны.

Андрэй Кузняцоў даў станоўчую ацэнку выканання рашэнняў папярэдняга, 17-га пасяджэння камісіі. Разам з тым, паводле яго слоў, па шэрагу кірункаў неабходна ўзмацніць узаемадзеянне. Ён агучыў перспектыўныя кірункі, па якіх мэтазгодна выбудоўваць далейшую сумесную работу. У ліку прыярытэтаў — павелічэнне аб'ёмаў двухбаковага гандлю з пашырэннем наменклатуры тавараў і забеспячэнне далейшага росту дабрабыту насельніцтва дзвюх краін.

— Беларускі бок гатовы прапанаваць Ірану якасную тэхніку, харчовыя тавары і зацікаўлены ў пастаўках садавіны і агародніны, фармацэўтычнай прадукцыі з Ірана, — адзначыў Андрэй Кузняцоў.

Важным пунктам двухбаковага парадку дня названа рэалізацыя сумесных праектаў у сферы прамысловай кааперацыі.

Міністр прамысловасці Беларусі таксама ініцыяваў перазагрузку інвестыцыйнага супрацоўніцтва і працяг работы адпаведных ведамстваў дзвюх краін.

Асаблівае значэнне надаецца навуковаму і адукацыйнаму супрацоўніцтву. З гэтай мэтай у 2026 годзе намечана правесці 8-е пасяджэнне змешанай беларуска-іранскай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне вышэйшай адукацыі, навукі і тэхналогій. Прадугледжваецца далейшае гуманітарнае ўзаемадзеянне па пытаннях культуры, спорту і турызму.

— Усе гэтыя кірункі супрацоўніцтва — рэальныя дзеянні, каб нашы адносіны сталі мацней і шматгранней, — сказаў Андрэй Кузняцоў і падкрэсліў важнасць няўхільнага выканання дасягнутых дамоўленасцяў, «каб на практыцы ўвасобіць узорную мадэль дружалюбнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі».

Па выніках падпісаны Пратакол 18-га пасяджэння змешанай беларуска-іранскай міжурадавай камісіі па пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва — план далейшага супрацоўніцтва на 2026 год па перспектыўных кірунках.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
10 снежня 2025 г. № 46 (827)




УНС У АСОБАХ

# ДЭЛЕГАТ — ГЭТА ГУЧЫЦЬ ГОДНА І АДКАЗНА

Ужо зусім хутка адбудзецца Усебеларускі народны сход. Дэлегаты збяруцца ў Мінску, каб абмеркаваць ключавыя вектары развіцця Беларусі. Сярод іх самыя розныя людзі. Тут і кіраўнікі вышэйшага звяна, і ўрачы, і настаўнікі, і рабочыя, і студэнты. Напярэдадні гэтай важнай падзеі карэспандэнты «Звязды» на месцах бліжэй пазнаёміліся з некаторымі дэлегатамі.

## «Я РАДЫ БЫЦЬ ЧАСТКАЙ ТАКОЙ ВАЖНАЙ ПАДЗЕІ»



**Уласны карэспандэнт па Гродзенскай вобласці адправілася ў Смаргонскі раён, дзе сустрэлася з дэлегатам УНС Раманам УСЦІНОВІЧАМ, начальнікам падраздзялення «Спецаўтагаспадарка» Смаргонскага РУП ЖКГ.**

Малады чалавек нарадзіўся ў Гомельскай вобласці, але калі яму было тры гады, бацькі пераехалі ў Смаргонскі раён, дзе ён і вырас. Раман скончыў Гомельскі дзяржаўны дарожна-будаўнічы каледж і па размеркаванні прыехаў працаваць у родны раён. Гэта было яго жаданне, і каб дакладна вярнуцца дадому, папрасіў заяўку ад смаргонскай ЖКГ, дзе былі патрэбны спецыялісты. Стаў працаваць механікам, паступіў завочна ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, скончыў яго ў студзені 2025-га. Цяпер яму 24, ён поўны энтузіязму! Гаворыць, што займаецца любімай справай, бо з дзяцінства яму падабалася тэхніка.

— Плануюі далей жыць і будаваць кар'еру ў родным горадзе. Для гэтага ёсць усе магчымасці! Было страшна пачынаць, калі я толькі прыйшоў пасля каледжа. Хваляваўся працаваць з людзьмі, якія ўдвая старэйшыя за цябе. Але калектыў вельмі добры, калегі дапамагалі ў адаптацыі, кіраўніцтва раёна падтрымлівала. Таму, калі мяне прызначылі на пасаду начальніка падраздзялення «Спецаўтагаспадарка», мне было ўжо спакойна, таму што я ведаю сваю працу і добра ладжу з калектывам.

Але Раман адзначае, што не меншую ролю ў яго паспяховай працы адыгрывае жонка, якая ва ўсім яго падтрымлівае. З Ксеніяй яны жанатыя ўжо год.

— Я вельмі хутка зразумеў, што Ксюша — мой чалавек. І для мяне сям'я вельмі важная, бо так здарова прыходзіць дадому не проста ў пустыя сцены, а ведаць, што там цябе чакае любімая жонка. Можа гучыць банальна, але гэта сапраўды так, — адказвае Раман на пытанне, ці не рана было ўступаць у шлюб. Усё гэта пачынаеш разумець, калі ў тваім жыцці з'яўляецца той самы чалавек, з якім ты можаш падзяліць усё — і горыч, і радасць.

У раёне маладога актыўнага чалавека прыкмецілі адразу — ён ахвотна ўдзельнічаў у розных мерапрыемствах, выказваў актыўную грамадзянскую пазіцыю. Акрамя таго, ён — старшыня Смаргонскага савета працуючай моладзі. Раман кажа, што грамадская дзейнасць яго захапляла, бо з'яўляліся новыя знаёмствы, пашыраўся кругагляд, ды і ён не з тых людзей, якія любяць сядзець на месцы.

Раман адзначае, што для яго вялікі гонар быць дэлегатам УНС, прызнаецца, што доўгі час не мог паверыць, што гэта сапраўды так.

— Як напісана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, УНС — гэта найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя. І, на мой погляд, вельмі важна, што ўсе мы можам узяць удзел у выбары шляху развіцця сваёй краіны. Я вельмі ганаруся, што буду часткай гэтай знамянальнай падзеі.

Раман зазначыў, што ўважліва вывучыў праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку і выдзяліў найбольш важныя для моладзі моманты. Адмысловая ўвага ўдзелена выхаванню патрыётаў і падтрымцы моладзі. Гэты блок накіраваны на сістэмнае ўключэнне моладзі ў грамадскае жыццё і фарміраванне сацыяльна актыўнага пакалення. Малады чалавек звярнуў увагу на мэтавы індыкатар — 15 % моладзі ў органах улады. Важна адзначыць прагрэс ад 13, 8 % у 2024 годзе.

— Асаблівая ўвага ўдзяляецца дыялогу і далучэнню моладзі праз нефармальныя інфармацыйныя мерапрыемствы і дыялогі. Падтрымка ініцыятыў уключае выяўленне і фінансаванне маладзёжных праектаў, стварэнне маладзёжных прастор і развіццё грамадска-кансультатыўных структур. Гэта стымулюе ініцыятыўнасць і самакіраванне, — гаворыць малады дэлегат. — Што не менш важна, праграма ставіць задачу не дэкларатыўна, а праз канкрэтныя механізмы, такія як падтрымка праектаў, стварэнне маладзёжных прастор і комплексны падыход да выхавання патрыётаў. Сістэмнае патрыятычнае выхаванне і ўцягванне моладзі ў рэальную практыку кіравання і грамадскага жыцця фарміруюць адказнае пакаленне, гатовае працаваць на карысць краіны.

## ТЭРЫТОРЫЯ КРЭАТЫЎНЫХ РАШЭННЯЎ



**Самыя каштоўныя інвестыцыі — гэта інвестыцыі ў адукацыю, бо без адукаваных спецыялістаў не зможа працаваць рэальны сектар эканомікі. Такім перакананнем напярэдадні УНС падзяліўся яго дэлегат, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральны дырэктар прыватнага вытворчага прадпрыемства «Вітбудтэхмаш» Андрэй СІДАРАЎ.**

Ён карэнны віцябчанін з сям'і савецкіх інтэлігентаў. З дзяцінства захапляўся тэхнікай, падчас тэрміновай службы ў арміі вырашыў звязаць лёс з машынабудаўніцтвам, набыў спецыяльнасць інжынера будаўніча-дарожных, пад'ёмна-транспартных машын і абсталявання. Дзесяць гадоў адпрацаваў галоўным інжынерам у Віцебскім аддзяленні Беларускай чыгункі. У 2004-м заснаваў сэрвіс па рамонце грузапад'ёмнай тэхнікі, які перарос у машынабудаўнічы завод «Віцебскія пад'ёмнікі», а цяпер вядомы як ПВГУП «Вітбудтэхмаш».

Гэта беларускі лідар па вытворчасці пад'ёмна-транспартнага абсталявання, 90 % прадукцыі якога з'яўляюцца інавацыйнымі распрацоўкамі. З яго цэха выйшаў самы вялікі ў СНД аўтагідрапад'ёмнік вышынёй 56 метраў. Штомесяц «Вітбудтэхмаш» выпускае да 60 адзінак спецыяльнай тэхнікі, поўнасцю забяспечвае ўнутраны рынак, арыентаваны на экспарт.

— Пяцігодка, якая мінае, — надзвычай актыўны перыяд, яна склалася для завода найбольш удала за ўвесь час яго існавання, — канстатаваў Андрэй Сідараў. — Шмат сіл і сродкаў было ўкладзена ў супрацьстаянне санкцыям, уведзеным супраць Беларусі. У любых умовах неабходна ўключаць мазгі, браць адказнасць. Вытрымаем і далей, проста трэба правільна будаваць праграму развіцця. Маштабуючы, гэту думку можна прымяніць у адносінах усёй краіны. Таму так важна, якая праграма развіцця Беларусі будзе зацверджана дэлегатамі УНС на наступную пяцігодку.

«Вітбудтэхмаш» робіць упэўненыя крокі ў кірунку выпуску інавацыйнай прадукцыі — магутных аўтамабільных кранаў-статоннікаў для расійскіх марскіх партоў, аэрапортаў і суднабудавання. Плануе выпускаць для іх уласныя шасі. Нездарма прадпрыемства пад кіраўніцтвам Андрэя Сідарава пазіцыянуе сябе як тэрыторыю крэатыўных рашэнняў.

— У наступнай пяцігодцы мы хацелі б убачыць сур'ёзную рэарганізацыю ў вышэйшай адукацыі, — адзначыў дэлегат УНС. — На жаль, сёння яна адарвана ад рэальнага сектара эканомікі. Мы маем вялікую патрэбу ў высокакваліфікаваных адукаваных спецыялістах. Сёння можна купіць абсталяванне, распрацаваць тэхналагічныя карты, але дзе ўзяць людзей? Без каманды ж нічога не працуе.

Нездарма па запыце машынабудаўнікоў БНТУ распрацоўвае новую адукацыйную праграму для падрыхтоўкі інжынераў па спецыяльнасці, якую раней скасавалі. Чакаецца, што першы набор будзе ўжо ў наступным навучальным годзе.

**(Заканчэнне на стар. 8)**

**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Экзито прайм»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2304 | Автокар протравитель семян ПС-10, инв. № 384 (без док.) | 1260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 2305 | Агрегат посевной Lemken Saphir, инв. № 385 (без док.) | 8928,00 | 892,80 | 446,40 |
| 2306 | Бочка алюминиевая для молока 500 л., инв. № 386 | 169,20 | 16,92 | 8,46 |
| 2308 | Водораздатчик БУ-ЗА, инв. № 388 | 612,00 | 61,20 | 30,60 |
| 2309 | Водораздатчик БУ-ЗА, инв. № 389 | 612,00 | 61,20 | 30,60 |
| 2310 | Емкость для молока из нержавеющей стали для установки УМ-1, инв. № 390 | 1764,00 | 176,40 | 88,20 |
| 2311 | Машина для внесения органических удобрений ПРТ-7А, инв. № 391 (без док.) | 2808,00 | 280,80 | 140,40 |
| 2312 | Полуприцеп одноосный тракторный, инв. № 392 (без док.) | 1332,00 | 133,20 | 66,60 |
| 2313 | Прицеп тракторный, инв. № 393 (без док.) | 1692,00 | 169,20 | 84,60 |
| 2315 | Прицеп-бочка для питьевой воды, инв. № 395 (без док.) | 432,00 | 43,20 | 21,60 |
| 2316 | Установка молокоохладительная УМ-4 4400 литров, инв. № 396 | 3528,00 | 352,80 | 176,40 |
| 2317 | Цистерна-полуприцеп МЖТ-10, инв. № 397 (без док.) | 1728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 2318 | Опрыскиватель для ядохимикатов с/х прицепной, инв. № 398 (без док.) | 3024,00 | 302,40 | 151,20 |
| В отношении лотов №№ 2304–2306, 2308–2313, 2315–2318 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 70 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 18.11.2025 | | | | |
| **Местонахождение:** Витебская обл., Браславский р-н, аг. Межаны. | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **23 декабря 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 10 декабря 2025 года до 16.00 19 декабря 2025 года | | | |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Экзито прайм», проводимых 23.12.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 2306, 2308, 2309 2315 – 10 %, по лотам №№ 2304, 2310–2313, 2316–2318 – 9 %, по лоту № 2305 – 8 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения (подписания) договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте **https://orgtorg.by.**
Дополнительная информация по предмету торгов – по тел. **+375 (29) 308-27-62, Екатерина**.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 304-25-60, Андрей (пн – пт с 09.00 до 18.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Общество с ограниченной ответственностью «Экзито прайм» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. 8 (029) 576 77 15, kp@p-k.by (211969, Республика Беларусь, Витебская обл., аг. Межаны, ул. Школьная, д. 1, УНП 391883426)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4. УНП 700016217 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Встроенное офисное помещение 491,1 кв. м** (инв. номер 710/D-54707). Адрес**: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 38а.** ***Обременение*****:** площади помещения сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 873 720,00 бел. руб.** (снижена на 10 %) | |
| Задаток **10 % от начальной цены предмета аукциона** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. **По** письменному заявлению покупателя может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости имущества на срок до 3 лет с ежемесячной индексацией платежей согласно договору купли-продажи, при первоначальном платеже не менее 20 % от цены продажи с учетом ранее внесенной суммы задатка | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,5 % от итоговой цены лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 04.10.2025 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.12.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.12.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Вольферда», 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, пом. 1 |

| № п/п | Наименование предмета электронных торгов, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, д. 4 | Общая площадь, кв. м | Начальная цена (с НДС 20 %), долл. США* |
|---|---|---|---|
| 1 | Модульный дом E8 BASE | 36,8 | **55 000,00** |
| 2 | Модульный дом VL-A2 | 17,4 | **23 000,00** |
| 3 | Купольная овальная беседка ФЗ.0 | 12, 0 | **5000,00** |

**Самовывоз: за счет покупателя**

**Оплата предмета электронных торгов производится в белорусских рублях в сумме, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения платежа*

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи (если не достигнута иная договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона)

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **5 %** от цены продажи в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.01.2026 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.01.2026 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



# ДЭЛЕГАТ — ГЭТА ГУЧЫЦЬ ГОДНА І АДКАЗНА

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Для аператыўнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй на «Вітбудтэхмашы» стварылі ўласны вучэбны цэнтр «Авідзій». Тут, напрыклад, хлопец-зваршчык можа атрымаць дадатковую спецыяльнасць, неабходную прадпрыемству, ці павысіць разрад. Завод гатовы прадастаўляць гэты цэнтр і свае вытворчыя плошчы як майстэрні для навучэнцаў ССНУ і ВНУ, каб яны прыходзілі на вытворчасць, маючы ўяўленне аб тым, як яна арганізавана і якія запыты прад'яўляць работадавец да іх кампетэнцый.

Андрэй Сідараў звязвае будучыню ПВП «Вітбудтэхмаш» з моладдзю. З гонарам адзначае, што сярэдні ўзрост працаўнікоў прадпрыемства агульнай колькасцю больш за 400 чалавек складае 32 — 36 гадоў.

— Гэта самы каштоўны наш патэнцыял, — адзначыў кіраўнік. — Падтрымліваць правільныя каштоўнасныя арыенціры могуць і павінны таксама прадпрыемствы і ўстановы. Да прыкладу, мы дапамагаем субсідыямі на набыццё жылля для тых маладых людзей, якія прынялі рашэнне звязаць свой лёс з нашым прадпрыемствам. Гэта дазваляе ім стварыць сем'і, нараджаць дзяцей. Акрамя нармальных умоў, выплаты годнай зарплаты, важна выхоўваць і падтрымліваць гонар за тое, што мы робім.

Дэлегат УНС упэўнены, што беларусы — разумны народ і ў краіне ёсць добрыя кампетэнцыі. Мяжа паміж 2025 і 2026 гадамі не стане кідком у бок ад шляху, якім мы ідзём. Рух наперад будзе паслядоўным, але трэба паскорыцца і выбраць надзейных спадарожнікаў.

## ГОЛАС МАЛЫХ ВЁСАК НА ВЯЛІКІМ СХОДЗЕ



**Новая старонка грамадскай дзейнасці старшыні Камунараўскага сельскага Савета дэпутатаў Буда-Кашалёўскага раёна Міхаіла БАРЫСЕВІЧА супала са знакавай падзеяй у яго жыцці — выбраннем дэлегатам VII Усебеларускага народнага сходу.**

Для Міхаіла Мікалаевіча гэта ўжо другі падобны адказны вопыт. У свой час, яшчэ дырэктарам Камунараўскай сярэдняй школы, Міхаіл Барысевіч упершыню быў абраны дэлегатам VI УНС. І вось новы этап служэння людзям супаў з грунтоўнымі прафесійнымі вехамі жыхара Буда-Кашалёўшчыны: 30 гадоў педагагічнай працы, два дзесяцігоддзі на пасадзе дырэктара школы, выбранне дэпутатам мясцовага Савета, пасля чаго — кіраўніком сельскага Савета дэпутатаў і дэлегатам VII Усебеларускага народнага сходу ўжо як прадстаўніком мясцовага самакіравання.

— Выдатна разумею, які вялікі давер мне аказаны. Усебеларускі народны сход, вядома, — унікальны орган улады са сваёй асаблівай роляй і функцыямі. Яго галоўная задача — прадстаўляць інтарэсы народа і выступаць у якасці платформы для абмеркавання і прыняцця важных рашэнняў, якія датычацца жыцця і будучыні краіны, — падкрэслівае Міхаіл Барысевіч.

Як нагадвае дэлегат, асабліва важна, што ў складзе Усебеларускага народнага сходу — прадстаўнікі ўсіх груп грамадства: службовыя асобы, прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай, судовай улад, мясцовых Саветаў дэпутатаў, грамадзянскай супольнасці. Дзякуючы чаму на УНС заслухоўваюцца меркаванні ўсіх груп насельніцтва, што дазваляе прымаць збалансаваныя і абгрунтаваныя рашэнні.

— Задачы, акрэсленыя ў праекце Праграмы на пяцігодку, якую будзем прымаць на сходзе, — вельмі маштабныя і патрабуюць цеснага ўзаемадзеяння дзяржавы і ўсіх слаёў насельніцтва. Асабліва значнымі лічу забеспячэнне дэмаграфічнай бяспекі, стварэнне якаснага і зручнага асяроддзя для жыцця, рэалізацыю турыстычнага патэнцыялу рэгіёнаў, — звярнуў увагу дэлегат. — Як кіраўніка сельвыканкама мяне, безумоўна, хвалюе развіццё інфраструктуры сельскіх населеных пунктаў, стварэнне спрыяльных умоў для пражывання людзей, а таксама пытанні павышэння эфектыўнасці мясцовага самакіравання.

Зона адказнасці старшыні Камунараўскага сельвыканкама — дзесяць населеных пунктаў, дзе пражывае больш за 2800 жыхароў. Камунар — цэнтр сельсавета, аграгарадок з развітай інфраструктурай. Тут знаходзіцца і буйная раённая сельгасвытворчасць — РУП «Беларуснафта-Асобіна», на якой працуе больш як дзве тысячы чалавек.

— Нам ёсць куды яшчэ расці, да чаго імкнуцца, удасканальвацца. У цэлым для сельскай мясцовасці вельмі важныя пытанні і паляпшэння стану дарог, развіцця транспартных зносін, павышэння забяспечанасці насельніцтва жыллём. Але самае галоўнае, што мы хочам жыць на вёсцы, без якой не можа быць і горада, — падкрэслівае Міхаіл Барысевіч.

Па словах Міхаіла Мікалаевіча, на першым пасяджэнні VII Усебеларускага народнага сходу дэлегаты атрымалі настолькі моцны эмацыянальны імпульс ад кіраўніка дзяржавы, што для ўсіх вельмі важна пераўтварыць яго ў плённую дзейнасць на карысць Радзіме.

— Адзін з галоўных пасылаў Прэзідэнта да кожнага беларуса — працаваць адказна на сваім месцы. Кіраўнік дзяржавы не раз звяртаў увагу, што краіна будзе рухацца наперад тады, калі ў цэнтры развіцця застанецца чалавек — яго ініцыятыва і жаданне паляпшаць уласнае жыццё. Гэта для нас, дэлегатаў — таксама прамое кіраўніцтва да канкрэтных дзеянняў. Магу сказаць, што заўважна гэта і на прыкладзе мясцовага самакіравання. Мы выступаем сёння як партнёры, якія дапамагаюць жыхарам населеных пунктаў аб'ядноўвацца і праяўляць актыўнасць.

## ЛЮДЗІ — ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ ЛЮБОЙ КРАІНЫ



**У гэтым упэўнены дэлегат УНС, дэпутат Магілёўскага аблсавета, галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Ігар КАСКО.**

Для Ігара Каско гэта будзе ўжо трэці Усебеларускі народны сход. На кожным з іх ён прысутнічаў у розных іпастасях, але заўсёды прадстаўляў інтарэсы сваіх шматлікіх выбаршчыкаў, бо быў спачатку дэпутатам гарсавета, потым аблсавета, затым членам Савета Рэспублікі. Яго асноўная дзейнасць — медыцына, але не менш увагі ён надае і грамадскай дзейнасці. Лічыць, што без гэтага нельга. Яна ў той ці іншай ступені звязаная з асноўнай работай і ўскосна дапамагае яе выконваць. Напрыклад, ён з'яўляецца старшынёй апорнага пункта аховы правапарадку №14, кантралюе пытанні законнасці ў вельмі густанаселеным мікрараёне «Спадарожнік». Там жыве вялікая колькасць маладых сем'яў, у тым ліку шматдзетных, шмат сацыяльнага жылля. Дзіцячы ўрач заўважае, што яго пазаслужбовая дзейнасць дапамагае не толькі займацца прафілактыкай правапарушэнняў, але і кантраляваць абстаноўку ў сем'ях, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, маніторыць сітуацыі з дзецьмі, якія жывуць у неспрыяльных умовах. А значыць, папярэджваць няшчасныя выпадкі, цяжкія траўмы. Як кажа Ігар Каско, лепш чым аперацыя, зробленая на высокім узроўні з прымяненнем перадавых тэхналогій, можа быць толькі магчымасць наогул абысціся без аперацыі.

Народны выбраннік адзначае, што УНС заўсёды былі лёсавызначальныя для краіны і збіраліся менавіта ў такія моманты, калі трэба было прымаць сур'ёзныя рашэнні. Сёмы па ліку УНС не выключэнне. На абмеркаванне вынесена праграма далейшага развіцця і дзейнасці краіны на працягу бліжэйшай пяцігодкі.

— Прэзідэнт пастаянна гаворыць: галоўнае — эканоміка, з усім астатнім мы справімся, — нагадвае дэлегат. — Будзе моцная эканоміка, будзе моцная і сацыялка, а значыць будуць моцныя сем'і, упэўненасць у заўтрашнім дні — усё тое, што дае стабільнасць у грамадстве. Будзем развіваць найноўшыя тэхналогіі ў сістэме аховы здароўя, адукацыі, іншых сферах. Больш увагі надаваць людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Насамрэч эканоміка і сацыяльнае развіццё вельмі моцна паміж сабой пераплецены. І звязаныя з гэтым моманты ўжо актыўна абмяркоўваюцца ў калектывах.

Ігара Каско асабіста вельмі хвалююць пытанні дэмаграфіі.

— Перакананы, што гэтая тэма таксама будзе закранацца і абмяркоўвацца на УНС у рамках дыялогу, — кажа суразмоўнік. — Я ў першую чаргу дзіцячы ўрач і бачу, як мяняецца ментальнае мысленне насельніцтва, уяўленне моладзі пра сям'ю, іх пазіцыя, калі лепш нараджаць дзяцей, іх сумненні, што лепш — дзіця або сабака. І гэта становішча патрабуе абмеркавання. Якой бы моцнай ні была дзяржава і яе эканоміка, аснова — гэта людзі. Як нам не пайсці па шляху Еўрапейскага кантынента, калі ў асноўнай масе краін нацыянальная ідэнтычнасць страчана? Усе гэтыя пытанні, як нам жыць, як развівацца, як забяспечыць стабільнасць, дэмаграфічную бяспеку, абавязкова трэба абмяркоўваць і выпрацоўваць агульныя рашэнні.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
**Святлана ЯКАЎЛЕВА,**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ООО «Аква Баня»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 12.01.2026.**

**Лот № 1**
**Здание специализированное автомобильного транспорта (Мойка)**
с инв. № 500/С-51790,
537,0 кв. м, г. Минск, ул. Промышленная, 15.

Земельный участок 500000000002010251, 0,3084 га.
Право аренды по 31.08.2030, доля в праве 29/50.
Обременения: Договор аренды.

Условие заключения договора купли-продажи:
заключение Победителем торгов
(Претендентом на покупку) договора аренды
с Продавцом сроком на 5 (пять) лет и более.

Начальная цена без НДС – 1 315 000,00 руб.
Задаток – 131 500,00 руб.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **08.01.2026 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**
УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона) по поручению **филиала «Острошицкий Городок» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже
**одним лотом недвижимого имущества в составе:**

- **здание коровника с выгульной площадкой с инв. № 600/С-171279 общей площадью 1 898,3 кв. м;**
- **склад комбикорма, инв. № 600/С-171211, общей площадью 23,6 кв. м;**
- **сенажная траншея № 2 д. Пухляки (2000 т.)** *(составные части и принадлежности: боковая стенка)***, инв. № 600/С-171332, общей площадью 963,3 кв. м;**
- **навозохранилище, инв. № 600/С-171799, общей площадью 1989 кв. м.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623685800001000468 площадью 1,2659 га *(право постоянного пользования)* по адресу: Минская область, Минский район, Шершунский с/с, район д. Пухляки.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Гуйка, пл. 1,2659 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0020 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 591 048,06** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 59 104,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 30 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 14.06.2024, 21.01.2025, 06.06.2025, 02.09.2025.

Аукцион состоится **08.01.2026** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.01.2026** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8017) 507-29-26, (8029) 126-15-04.**
УНП 601088558

# НЕЛЬГА БЫЦЬ БЕЗДУХОЎНЫМІ

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## Аб чым гаворыць дэпутат са сваімі выбаршчыкамі, калі ён — вядомы пісьменнік



Аб асаблівасцях работы з выбаршчыкамі аднаго з самых гістарычна значных раёнаў Гомеля расказаў член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў, заслужаны дзеяч культуры краіны, вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Гаўрыловіч.

— Цэнтральны раён Гомеля, які я прадстаўляю, — культурна-асветніцкі, з надзвычай багатай гісторыяй і традыцыямі, — гаворыць дэпутат. Разам з тым нямала і буйных прамысловых прадпрыемстваў: ад лёгкай прамысловасці да машынабудавання ды харчовай прамысловасці, будаўнічых і навуковых устаноў, шмат арганізацый, якія займаюцца развіццём культуры, спорту, малога і сярэдняга бізнесу, шэраг прэстыжных вышэйшых і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Невыпадкова падчас сустрэч з выбаршчыкамі я часта падкрэсліваю: наш раён — не проста частка старажытнага горада, а сапраўдная яго душа. І калі мне ўдаецца нешта карыснае, адметнае зрабіць для стварэння спрыяльнага асяроддзя ў паўсядзённым жыцці гамяльчан, я шчыра радуюся кожнай, нават зусім маленькай падзеі. Гэта датычыць і падтрымання шматлікіх ініцыятыў, што зыходзяць ад моладзі, ад усіх жыхароў, якія імкнуцца ўнесці свой уклад у развіццё роднага горада.

***— А ці быў нейкі адметны для вас наказ ад выбаршчыкаў з улікам таго, што вы — вядомы пісьменнік?***

— Так. Я не забываюся пра бадай галоўны наказ, атрыманы ад выбаршчыкаў у лютым 2024-га: пашыраць культурна-асветніцкі патэнцыял жыхароў раёна і найперш школьнікаў і моладзі. І стараюся трымаць дадзенае абяцанне. Бягучай вясной, дзякуючы партнёрству з вядомымі расійскімі пісьменнікамі — лаўрэатамі Патрыяршай прэміі, з іх непасрэдным удзелам і пры падтрымцы архіепіскапа Гомельскай епархіі Стэфана, упершыню надзвычай маштабна прайшоў у гарадскім Цэнтры культуры праваслаўны форум «Радасць слова». А ва ўніверсітэце імя Ф. Скарыны была наладжана асветніцкая канферэнцыя, прысвечаная славянскаму асветніку Кірылу Тураўскаму... Культурна-асветніцкія ініцыятывы падтрымлівае кіраўніцтва раёна, горада, вобласці. Нам дапагаюць абласная, гарадская бібліятэкі, работнікі ВНУ і школ. Да таго ж у мяне выдатная каманда паплечнікаў, калег-аднадумцаў, якія шчыра падтрымліваюць і дапамагаюць рэалізаваць задуманае. Зрабіўшы адно, мы не спыняемся, праводзім работу, ладзім шмат конкурсаў. Для чаго? Каб людзі вярталіся да чытання якаснай літаратуры, далучаліся да мастацтва. Робіцца гэта дзеля сённяшняга і будучых пакаленняў. Калі грамадства будзе бездухоўным — чакай бяды. Культурна-асветніцкая дзейнасць сугучная дэпутацкай, бо дапамагае быць у кантакце з выбаршчыкамі, чытачамі.

***— Ці часта да вас звяртаюцца па дапамогу выбаршчыкі ў акрузе? Якія пытанні і праблемы агучваюць?***

— За 11 месяцаў бягучага года прыняў звыш 150 чалавек. Праблемы агучваюць розныя: і грамадскія, і асабістыя. У асноўным — да 80 % — датычацца камунальных аспектаў: стан ацяплення, рамонты дахаў, пад'ездаў, добраўпарадкаванне і якаснае абслугоўванне прыдамавых тэрыторый, стан дзіцячых пляцовак, жыллёвыя аспекты. А яшчэ рэалізацыя грамадзянскіх ініцыятыў, работа пасажырскага транспарту — кола пытанняў вельмі шырокае. У большасці як дэпутат знаходжу паразуменне з прадстаўнікамі адказных арганізацый, ад якіх залежыць іх станоўчае вырашэнне, калі патрабаванні законныя. На жаль, здараюцца і выпадкі «неабгрунтаванага зацягвання» той ці іншай праблемы з-за чалавечага фактару — непрафесійных падыходаў, напрыклад, асобных спецыялістаў жыллёва-камунальных службаў. Напрыклад, рамонт пад'езда ў адным з мікрараёнаў горада за сабраныя жыхарамі сродкі неапраўдана зацягнуўся больш чым на год, і толькі пасля непасрэднага ўмяшальніцтва дэпутата рамонт аператыўна ажыццёўлены, а адказныя асобы былі прыцягнуты да адказнасці. Ці можна было зрабіць адразу па-людску? Так. Можна. Але не атрымалася. Цяпер жыхары задаволены рамонтам. І гэта важна.

***— Ці ўносяць выбаршчыкі нейкія прапановы па ўдасканаленні заканадаўства?***

— Так. І вельмі актыўна. Адрасуюць шмат канструктыўных прапаноў, якія знаходзяць увасабленне ў праектах законаў ці пастановах, рашэннях асобных ведамстваў. Напрыклад, такія прапановы ўлічаны пры прыняцці Кодэкса аб адукацыі. Альбо толькі што два важныя ўдакладненні ўлічаны пры прыняцці законапраекта «Аб натарыяльнай дзейнасці». Падчас правядзення лістападаўскага прыёму двое выбаршчыкаў звярнуліся са слушнымі прапановамі па ўдасканаленні Працоўнага кодэкса. Буду прапрацоўваць гэтыя ініцыятывы. На мой погляд, людзі маюць рацыю.

***— Ведаю, што асобны кірунак вашай дэпутацкай дзейнасці — гэта работа з моладдзю...***

— Іначай і не можа быць, таму што моладзь — наша будучыня. Асабліва часта бываю ў студэнцкіх аўдыторыях. Нядаўна на прыёмах, дарэчы, разглядалі з адпаведнымі спецыялістамі пытанні працаўладкавання маладых спецыялістаў, прававыя аспекты прымянення на практыцы працоўнага заканадаўства аб іх падтрымцы. Акрамя таго, працуючы з моладдзю, адкрыта гаворым аб жыццёва важных арыенцірах, якія будуць прыняты ў снежні на Усебеларускім народным сходзе і будуць вызначаць развіццё Беларусі на найбліжэйшае пяцігоддзе. Бачу іх, маладых, шчырую зацікаўленасць. І гэта радуе.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# КАБ ПАКУПКІ БЫЛІ ПРЫЕМНЫМІ

## Дэпутаты Мінгарсавета правяраюць арганізацыю гандлю ў Мінску ў перадсвяточныя дні



У прыватнасці, **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН** сумесна з адміністрацыяй Фрунзенскага і раённым цэнтрам гігіены наведаў магазін на вуліцы Янкі Маўра, які ўваходзіць у Адоеўскую выбарчую акругу. Па выніках маніторынгу было адзначана, што тавары паўсядзённага попыту і прадукты харчавання прадстаўлены ў краме ў дастатковым аб'ёме і належнай якасці.

Старшыня Мінгарсавета адзначыў таксама чысціню і акуратнасць гандлёвага аб'екта. «Крама ўжо аформлена да навагодніх свят. Што датычыцца неабходнага набору, а гэта перш за ўсё агародніна і хлебабулачныя вырабы, яны прадстаўлены ў неабходным асартыменце», — сказаў Арцём Цуран.

Асаблівая ўвага ў ходзе маніторынгу надавалася не толькі якасці рэалізуемых тавараў, але і наяўнасці ў продажы прадукцыі беларускіх вытворцаў. Старшыня Мінгарсавета заклікаў узмацніць прыкасавы гандаль магчымасцямі айчынных вытворцаў.

Такія рэгулярныя маніторынгі дазваляюць трымаць руку на пульсе, падкрэсліў Арцём Цуран. «Важна чуць кожнага пакупніка, аператыўна рэагаваць на заўвагі, няхай гэта будзе свежасць агародніны або адсутнасць кас самаабслугоўвання. Кожны магазін павінен быць месцам, дзе прыемна рабіць пакупкі. Наша задача — не проста кантраляваць, а рэальна дапамагаць паляпшаць якасць жыцця гараджан, — дадаў ён. — Такія праверкі будуць працягнуты. Мы адводзім на гэта ўвесь снежань. Будзе надавацца ўвага і так званаму «навагодняму сталу», каб практычна ўвесь святочны набор можна было купіць у любой краме крокавай даступнасці. Работа дэпутатаў Мінгарсавета — гэта перш за ўсё клопат пра нас з вамі. Яна накіравана на тое, каб перадсвяточныя пакупкі былі прыемнымі, а сталы — поўнымі смачных і якасных прадуктаў».

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Ксеніі ЛІННІК.**

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390)
извещает о проведении повторных электронных торгов
в форме открытого аукциона по продаже
транспортных средств, бывших в употреблении
(местонахождение: Минская обл., г. Логойск, ул. Тимчука, д. 21).
**Продавец имущества: Логойская райветстанция.**
**Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка»,**
г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**)

| Лот № | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Легковой специальный джип UAZ 315148-065**, 1095 IX-5, 2012 г. в. | 6 900,00 |
| 2 | **Легковой специальный внедорожник универсал CHEVROLET NIVA-212300-55**, 3508 KI-5, 2014 г. в. | 7 900,00 |

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 24.12.2025. Дата и время окончания приема заявок:** по **23.12.2025** до 17.00 – на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Государственного комитета по имуществу и Минского облисполкома

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 – 31/50 доли в праве собственности на здание нежилое** (инв. № 450/С-2946, 6158,8 кв. м, сост. части: подвал, бордюры, покрытия, благоустройство, газон). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Коссовский Тракт, 100.** В состав лота входят **канализационные сети** (инв. № 450/С-31477, 82,6 м).
***Сведения о земельных участках***: пл. **0,8074** га, предоставлен на праве постоянного пользования; три участка предоставлены на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072) пл. **0,0001 га, 0,0001 га, 0,0016** га. **Обременения: площади здания, принадлежащие продавцу, частично сданы в аренду.** Подробная информация у организатора торгов и на сайте cpo.by

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 3 888 504,00 бел. руб.**

**Лот № 2 – Здание** (инв. № 450/С-24780, общ. пл. 414,8 кв. м, сост. части: две пристройки); **канализационные сети** (инв. № 450/С-24783, сост. части: канализац. колодец); **тепловая сеть** (инв. № 450/С-24781). **Обременение: договор аренды.**
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 67, корп. 1.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0587 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.09.2071) для строительства и размещения объектов коммунального хозяйства.
В состав лота входит иное имущество: линия электросетей м-н Интерьер

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 306 152,42 бел. руб.**

**Лот № 3 – Склад (баня)** (инв. № 450/С-18993, общ. пл. 318 кв. м, составные части: уборная, три пристройки, ворота, забор). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1445 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 01.11.2041) для строительства и обслуживания здания склада (бани)

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 19 320,00 бел. руб.**

**Лот № 4 – Столовая** (инв. № 450/С-18925, общ. пл. 672,7 кв. м, составные части: Подвал, две пристройки, электроснабжение (1), канализационная сеть (Д), водопроводная сеть (Е), канализационный колодец (д1), водопроводный колодец (е1), покрытие (Ж, И, К), плиточное покрытие (Л), бордюр тротуарный (Л1), ограждение (М, Н), калитка (Н1)). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1316 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 20.09.2071) для строительства и обслуживания здания столовой

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 289 200,00 бел. руб.**

**Лот № 5 – Административное здание (совместно с гаражом и котельной)** (инв. № 450/С-29152, общ. пл. 547,3 кв. м, сост. части: пристройка, дымовая труба), **склад № 2** (инв. № 450/С-29155, общ. пл. 568 кв. м, сост. части: Пристройка (2Б/кз), пристройка (1)); **трансформаторная подстанция** (инв. № 450/С-29156, общ. пл. 40,1 кв. м); **здание проходной** (инв. № 450/С-29153, общ. пл. 31,6 кв. м); **благоустройство территории** (инв. № 450/С-31422, общ. пл. 1076,1 кв. м, сост. части: А-Благоустройство территории, а.1 Покрытие, а1.1Бордюр, а2 Ограждение, а2.1 Ворота, а3 Эстакада, а3.1 Ограждение). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Минский Тракт, д. 4, корп. 1-3, д. 4, 4/4.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,6679 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 30.07.2068) для размещения объектов оптовой торговли, материально-технич. и продовольствен. снабжения, заготовок и сбыта продукции.
В состав лота входит иное имущество: котел отопительный твердотопливный КОТВ-95; насос К45/30с дв. 7,5/3000

**Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 386 640,00 бел. руб.**

**Лот № 6 – Нежилое здание,** инв. № 450/С-24046, общ. пл. 415,5 кв. м. Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д. 13.** В состав лота входят **линия электропередачи** (инв. № 450/С-23996, 6,0 м), **водопроводная сеть** (инв. № 450/С-23995, 79,0 м).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0457** га, предоставлен на праве аренды по 12.07.2071 для строительства и обслуживания зданий по улице Я. Купалы, 13

**Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 26 653,20 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 – **2 %**, по лотам №№ 2, 4, 5 – **4 %,** по лотам №№ 3, 6 – **6 %** от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 22.11.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.12.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.12.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by**




# ЗА ТАКІМІ ПРАЕКТАМІ — РОСТ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ

2025 ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

## У аграгарадку Беразінскае Маладзечанскага раёна добраўпарадкавалі гістарычны парк

Другое жыццё гэтай зоне адпачынку было дадзена ў рамках рэалізацыі грамадзянскай ініцыятывы. Цяпер у парку ёсць месца і для заняткаў спортам з выкарыстаннем сучасных трэнажораў, і для культурнага баўлення часу. Калі ў лічбах, было ўладкавана больш за два кіламетры пешаходных дарожак, ліквідавана 62 аварыйныя дрэвы, каля 300 — абрэзана. Акрамя таго, выдалілі пустазельную расліннасць плошчай звыш трох гектараў. Да гэтых добрых спраў далучыліся і мясцовыя жыхары.



На рэалізацыю праекта з дзяржаўнага бюджэту было выдзелена **122 тысячы рублёў**, яшчэ **13 тысяч сабралі самі жыхары** аграгарадка.

Ініцыятыву па добраўпарадкаванні парку дэпутат Палаты прадстаўнікоў Святлана Сакалоўская і мясцовыя жыхары афармілі ў выглядзе праекта, які адправілі на конкурс грамадзянскіх ініцыятыў у Мінскі абласны Савет дэпутатаў.

На адкрыцці парку прысутнічаў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА**. Ён асобна адзначыў цеснае ўзаемадзеянне органаў улады, дэпутацкага корпуса, жыхароў населенага пункта, якія сумеснымі намаганнямі рэалізавалі задуманае. «Упэўнены, што гэты парк стане месцам прыцягнення як мясцовых жыхароў, так і гасцей Беразінскага, — сказаў губернатар Міншчыны. — У Мінскай вобласці на рэгулярнай аснове рэалізоўваюцца праекты ў рамках конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў. Жыхары цэнтральнага рэгіёна актыўна прымаюць у ім удзел, размяшчаюць заяўкі — потым, ужо камісійна, вызначаюцца пераможцы. Сёлета іх сем. Усе гэтыя праекты рэалізаваны. І пацвярджэнне таму — знакавы праект па добраўпарадкаванні парку ў аграгарадку Беразінскае Маладзечанскага раёна».



Навіна аб прыездзе Аляксея Кушнарэнкі ў аграгарадок імгненна разляцелася. Мясцовым жыхарам удалося пагутарыць з губернатарам. Людзі дзякавалі за дапамогу ў добраўпарадкаванні парку.

Так, **жыхарка населенага пункта Клаўдзія** асобна звярнулася да кіраўніка цэнтральнага рэгіёна. «Насельніцтва Беразінскага — больш чым 1300 чалавек. Ёсць каледж, школа, іншыя сацыяльныя аб'екты, а вось добрага, грунтоўнага месца адпачынку, дзе можна гуляць з дзецьмі, мужам, мамай, не было. Вялікі дзякуй вам за падтрымку! І гэтая падзяка не толькі ад мяне — ад усяго насельніцтва Беразінскага. Калі б не падтрымка на ўзроўні вобласці, раёна, мы б самі нічога не зрабілі».

У адказ на гэта губернатар падкрэсліў, што добраўпарадкаванне тэрыторыі — вынік сумеснай працы і зацікаўленасці. «Парк сапраўды выдатны. Тут сфарміраваны асобныя зоны адпачынку, ёсць пляцоўкі для заняткаў спортам, культурнага вольнага часу, — падзяліўся ўражаннямі Аляксей Кушнарэнка. — У плане фінансавых укладанняў гэты праект даволі дарагі: агульны яго кошт большы за 135 тысяч, з якіх 122 тысячы — бюджэтнае фінансаванне. Але гэтыя расходы апраўданыя. Бо за такімі праектамі — рост якасці жыцця нашых людзей».

### Даслоўна

**Член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ** расказала, што сёлета на конкурс грамадзянскіх ініцыятыў было пададзена 38 заявак. Спецыяльнай камісіяй вызначана 7 праектаў-пераможцаў. «Усе гэтыя праекты ўжо рэалізаваныя. На іх фінансаванне накіравана 400 тысяч з рэспубліканскага і абласнога бюджэту. Суфінансаванне грамадзян — больш за 44 тысячы, — адзначыла старшыня аблсавета. — Дарэчы, гэта было абавязковай умовай удзелу ў конкурсе: уклад насельніцтва — у памеры, не меншым за 10 % ад кошту ініцыятывы. З сямі праектаў-пераможцаў большасць накіраваны на добраўпарадкаванне тэрыторыі. Як прыклад — парк у Беразінскім Маладзечанскага раёна».

**Яна ВАЛАСАЧ**
**Фота прэс-службы Мінскага аблвыканкама**

Мясцовае Самакіраванне — Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 11 129. Нумар падпісаны ў 19.30 9 снежня 2025 года.

АЗДАРАЎЛЕННЕ

# ЗАБРАНІРАВАЦЬ НОВЫ ГОД

## На святы ў беларускіх здраўніцах адпачнуць каля 25 тысяч чалавек

**На навагоднія святы ўсе беларускія санаторыі ўжо цалкам забраніраваны. Чакаецца, што з 25 снежня да 7 студзеня ў іх адпачне 24-25 тысяч чалавек, прычым палова з іх — замежнікі. Кошт навагодняга банкету ў санаторыях сёлета складзе каля 310 рублёў. Ахвотных правесці такім чынам галоўныя зімовыя святы дастаткова, таму знайсці вольныя месцы ўжо цяпер магчыма хіба што выпадкова — толькі калі хтосьці адмовіцца.**

### ПОПЫТ ДЫКТУЕ ЦЭНЫ

Кошт адных сутак у санаторыі ў навагоднія святы ў сярэднім складае 157 рублёў. Маецца на ўвазе двухмесны стандартны нумар. Трэба сказаць, што з улікам павышанага попыту і вялікай колькасці забаўляльных мерапрыемстваў гэта цана вышэйшая, чым у сярэднім па году (а гэта 135 рублёў). А вось адпачынак у не самы папулярны асенне-зімовы час складае ў сярэднім 134 рублі за суткі.

Як расказаў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ,** прагназуецца, што ў першым квартале наступнага года цэны ў параўнанні з бягучым годам не зменяцца — сярэдні кошт застанецца на ўзроўні 135 рублёў за суткі. Гэта і зразумела: зімовы час куды менш папулярны ў адпачывальнікаў, чым летні. Аднак браніраванне ідзе даволі актыўна: на студзень у беларускіх здраўніцах забраніравана ўжо 67 % месцаў, на люты — 50 % нумароў.

У цэлым жа запоўняльнасць санаторыяў сёлета была вельмі высокай і перавысіла мінулагоднюю, склаўшы больш за 86 %. Аздараўленне прайшло больш як беларусаў, так і замежнікаў — агульная лічба перавышае 1,5 мільёна чалавек, а колькасць замежных грамадзян — 250 тысяч. Рост экспарту лячэбна-аздараўленчых паслуг складае 25 %, а абсалютная лічба перасягнула мінулагоднюю яшчэ па выніках 9 месяцаў. Летась экспарт паслуг за год прынёс 402 мільёны рублёў, а сёлета ўжо ў верасні ён перасягнуў 414 мільёнаў.

— Усе санаторна-курортныя арганізацыі працуюць са станоўчым эканамічным вынікам, калі браць пасляковідны перыяд пасля 2021 года, у тым ліку і дзіцячыя ўстановы, нават улічваючы той факт, што большая частка пуцёвак набываецца за сродкі рэспубліканскага бюджэту. Сёння мы нацэльваем у тым ліку і дзіцячыя санаторыі на павелічэнне колькасці пуцёвак у свабоднай рэалізацыі, экспарт паслуг. І штогод адзначаем павелічэнне долі паслуг у свабоднай рэалізацыі і на экспарт, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.



### ПЛАНУЕЦЦА НОВАЕ БУДАЎНІЦТВА

На сёння ў Беларусі гасцей прымае 97 санаторыяў на 28 тысяч месцаў і 42 аздараўленчыя арганізацыі на 9 тысяч месцаў. Аднак, улічваючы высокі попыт на такога кшталту паслугі, плануецца будаўніцтва новых здраўніц.

— Перагаворы з інвестарамі вядуцца. Сёння пастаўлена задача па павелічэнні долі турызму ў ВУП краіны, у тым ліку павінен зрабіць свой унёсак лячэбна-аздараўленчы турызм. Актуальнасць гэтага пытання падкрэсліў і Прэзідэнт пры наведванні Бярэзінскага запаведніка. Таму пастаўлена задача будаваць новыя аб'екты лячэбна-аздараўленчага турызму, бо гэта перспектыўна і эканамічна мэтазгодна, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі. — Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні па даручэнні ўрада распрацаваны пералік перспектыўных месцаў з мінеральнымі водамі, азёрамі з лячэбнымі гразямі, якія можна распрацоўваць і выкарыстоўваць з лячэбнай мэтай. Сёння гэта інфармацыя ў агульным доступе размешчана на сайце Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні, на сайтах выканкамаў. Спадзяюся, што інвестары будуць больш актыўна прыцягвацца ў гэту сферу.

### КАНІКУЛЫ З КАРЫСЦЮ

Падчас зімовых канікул з 25 снежня да 7 студзеня будуць працаваць аздараўленчыя лагеры для школьнікаў. Іх адкрыецца каля 2 тысяч па ўсёй краіне. Пераважна гэта будуць дзённыя лагеры на базе школ. Яны прымуць, згодна з папярэднімі заяўкамі, каля 64 тысяч дзяцей.

**Алена КРАВЕЦ.**

АДПАЧЫНАК

# НОВЫЯ МАРШРУТЫ ДЛЯ ПАДАРОЖНІКАЎ

## У студзені «Белавія» адкрывае палёты ў Тайланд

**Пра тое, якія перспектывы адкрывае гэты кірунак, расказаў генеральны дырэктар авіякампаніі Ігар ЧАРГІНЕЦ.**



Паводле яго слоў, запуск тайландскіх рэйсаў стане знакавай падзеяй. «Мы пачынаем палёты ў новую для нас краіну. Гэта ўжо 17-я краіна на карце палётаў «Белавія», — адзначыў Ігар Чаргінец. Першы рэйс адбудзецца 8 студзеня ў Патаю (аэрапорт Утапао), адкуль пасажыры змогуць з лёгкасцю дабрацца да Бангкока. Праз некалькі дзён, 11 студзеня, будуць адкрыты рэйсы на Пхукет.

Загрузка, паводле слоў кіраўніка авіякампаніі, ужо цяпер вельмі высокая: «Пхукет крыху больш запатрабаваны, чым Патая. Гэта не значыць, што загрузка туды слабая — яна добрая, проста на Пхукет жадаючых больш». Рэйсы будуць выконвацца на новых Airbus A330, а працягласць палёту — прыблізна 10 гадзін. Пакуль рэйсы будуць чартэрнымі, але ідзе работа над тым, каб пераўтварыць іх у рэгулярныя.

Разам з тайландскімі рэйсамі «Белавія» рыхтуецца да шэрагу іншых важных падзей. З 18 снежня пасля чатырохгадовага перапынку з'явяцца рэйсы ў Алматы. А 8 студзеня авіякампанія аднаўляе палёты ў Тэль-Авіў. Продаж білетаў ужо адкрыты. Увесну плануюцца рэйсы ў Іарданію, а таксама ў Туніс.

Паводле слоў Ігара Чаргінца, 2025 год можна лічыць для «Белавіі» сапраўды прарыўным: «Былі прыкладзены вялікія намаганні ў папярэднія гады. Дальнемагістральныя самалёты дазволілі нам адкрыць новыя напрамкі — Санья ў Кітаі, В'етнам, Шры-Ланка. Цяпер — Тайланд».

**Першы намеснік міністра замежных спраў Сяргей ЛУКАШЭВІЧ** адзначыў, што запуск новых рэйсаў у краіны Паўднёва-Усходняй Азіі стаў лагічным працягам маштабнай работы, якая вядзецца на дыпламатычным узроўні.

«Белавія» фактычна ўварвалася ў рэгіён Паўднёва-Усходняй Азіі. Гэтаму папярэднічала планамерная работа МЗС. У ліпені міністр замежных спраў Максім Рыжанкоў наведаў Тайланд, і ўжо тады пытанне адкрыцця прамых авіязносін абмяркоўвалася з калегамі. І сёння мы бачым вынік», — падкрэсліў ён.

Асобна Сяргей Лукашэвіч звярнуў увагу на тое, што Беларусь паслядоўна працуе над тым, каб кантынентальная Паўднёва-Усходняя Азія стала бязвізавай зонай для беларускіх турыстаў.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## по продаже права на размещение средства наружной рекламы на земельном участке, относящемся к землям общего пользования г. Бреста

| № лота | Наименование и местонахождение объекта | Форма объекта | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Срок аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право размещения средства наружной рекламы на земельном участке, относящемся к землям общего пользования г. Бреста, по адресу: г. Брест, **район кольцевой развязки на Варшавском шоссе** | рекламный щит | **756,00** | 756,00 | 3 года |
| **Общие требования** | 1. Требуется разработка проекта привязки средства наружной рекламы в установленном порядке.<br>2. Количество опорных стоек – 1.<br>3. Количество рекламных полей – 2. | | | | |
| **Характеристики объекта** | 1. Размер рекламного поля 6000*3000 мм.<br>2. Площадь рекламного поля 18 кв. м.<br>3. Высота низа нижней окантовки рекламных полей в пределах 4,5 м над уровнем асфальтного покрытия проезжей части.<br>4. Диаметр опоры не более 325 мм.<br>5. Цвет средства наружной рекламы, покрытие подлежат согласованию при получении паспорта средства наружной рекламы.<br>6. Средство наружной рекламы должно иметь маркировку с указанием владельца и его контактного номера телефона; внешнюю подсветку рекламной конструкции.<br>7. Средство наружной рекламы устанавливается на фундаментном блоке габаритами 3,0*2,0*1,0 м, который выполняется из монолитного железобетона с заложенными шпильками.<br>8. Подключение к источнику электроснабжения осуществляется закрытым способом с использованием изолированного провода. Электромонтажные работы включают в себя установку кронштейнов и прожекторов | | | | |
| **Организатор торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», тел. 53-81-92, г. Брест, ул. Ленина, 50-23 | | | | | |
| **Условия оплаты разовый платеж** | **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определённых Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утверждённым постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы» – **4 200,00 руб.** | | | | |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, в адрес организатора аукциона подать заявление, подписать соглашение с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», прилагаются к заявлению, подаваемому:

*юридическим лицом:* копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*индивидуальным предпринимателем:* копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*физическим лицом* – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения: *физическое лицо, индивидуальный предприниматель* предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность; *представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица* предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Сумма задатка в размере начальной цены продажи перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924, в срок по 06.01.2026 г.**

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утверждённым постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников под роспись;

перечислить на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в протоколе о результатах аукциона (о признании аукциона несостоявшимся), сумму средств, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

**в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов** заключить договор на размещение средства наружной рекламы после оплаты суммы средств, за которую продан предмет аукциона, и оплаты расходов на организацию и проведение аукциона.

| | |
|---|---|
| **Аукцион состоится 13 января 2026 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607** | **Заявления на участие в аукционе принимаются** с 8.30 **10.12.2025 г.** до 15.00 **06.01.2026 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23** |
| **Контактный телефон 53-81-92. Сайт: www.bgcn.by, www.city.brest.by** | |

# ТРЭНІРОЎКА ПЕРАД ГАЛОЎНЫМ ІСПЫТАМ

## У РЭЖЫМЕ РЭАЛЬНАГА ІСПЫТУ

У Міністэрстве адукацыі нагадалі пра бясспрэчныя перавагі ўдзелу ў гэтым іспыце. Па-першае, маладыя людзі азнаёмяцца з самой працэдурай ЦЭ — ад уваходнага кантролю і рассаджвання да правіл запаўнення экзаменацыйных бланкаў. Другі і, магчыма, найважнейшы аспект — школьнікі змогуць ацаніць свой узровень ведаў па прадмеце з выкарыстаннем рэальных экзаменацыйных матэрыялаў, а яшчэ — навучыцца эфектыўна размяркоўваць час ва ўмовах, максімальна набліжаных да экзамену, знізіць трывожнасць і да ЦЭ прыйсці ўпэўненымі ў сабе.



## ЗАЛОГ ПОСПЕХУ — ДАКЛАДНАСЦЬ І САБРАНАСЦЬ

Часам ажыццявіць мару перашкаджае не адсутнасць неабходных ведаў, а элементарная недысцыплінаванасць. Таму спецыялісты адукацыйнага ведамства рэкамендуюць школьнікам рыхтавацца да рэпетыцыі і працаваць з той жа адказнасцю, што і на асноўным ЦЭ.

Абавязкова трэба памятаць, што ўдзельнікі РЦЭ, якія не зарэгістраваліся загадзя або якія не маюць пры сабе дакумента, што сведчыць асобу, да праходжання іспыту не дапускаюцца. Не дапускаюцца і тыя, хто прыбыў на РЦЭ пасля раскрыцця пакета з экзаменацыйнымі работамі.

### ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ

► Пасля завяршэння працэдуры рэгістрацыі для ўдзелу ў рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену ўдзельніку РЭ выдаецца пропуск.

► Удзельнік РЭ мае права зарэгістравацца для ўдзелу ў РЦЭ па беларускай або рускай мове ці адным профільным прадмеце (на выбар).

► На РЭ па хіміі і фізіцы (толькі на гэтых прадметах!) можна карыстацца калькулятарам, які не з'яўляецца сродкам захоўвання, прыёму і перадачы інфармацыі.

► Прытрымлівацца дзелавога стылю адзення.

► У пункт правядзення неабходна РЭ прыбыць з пропускам, дакументам, які сведчыць асобу (пашпарт, ID-карта (пластыкавая смарт-карта), від на жыхарства, пасведчанне бежанца, даведка, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента, што сведчыць асобу.

► Ручка павінна быць гелевай або капілярнай з чарнілам чорнага колеру.

## НЕ ВЫХОДЗЯЧЫ З ДОМУ

12 лістапада 2025 года Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў запусціў новы фармат здачы РТ — дыстанцыйны. Гэта значыць, абітурыенты могуць праходзіць рэпетыцыйнае тэсціраванне непасрэдна дома. Такая праверка ведаў даступная не толькі будучым выпускнікам, але і ўсім жадаючым — ніякай рэгістрацыі для праходжання тэсту не трэба, усё размешчана ў адкрытым доступе. У РІКВ Мінадукацыі расказалі, што прайсці дыстанцыйнае рэпетыцыйнае тэсціраванне можна па 14 прадметах. Заданні па тэмах і складанасці набліжаны да тых, якія будуць на ЦЭ і ЦТ.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЦІКАВА АБ ЗЯМЛІ

## Незвычайны геалагічны клас адкрылі ў Мінску

«Клас Карпінскага» з'явіўся ў сталіцы на базе Навукова-вытворчага цэнтра па геалогіі. Новая асветніцкая пляцоўка стане цэнтрам прыцягнення як для профільных спецыялістаў, так і навучэнцаў, а таксама будзе садзейнічаць беларуска-расійскаму ўзаемадзеянню ў галіне нетракарыстання.




«Клас Карпінскага» — унікальны міжнародны адукацыйны праект, створаны на базе Усерасійскага навукова-даследчага геалагічнага інстытута імя А. П. Карпінскага. Місіяй яго з'яўляецца ўдасканаленне ведаў прафесійных геолагаў і будучых маладых спецыялістаў: студэнтаў профільных ВНУ, юных удзельнікаў геалагічных і экалагічных гурткоў. Тут можна не толькі павысіць сваю кваліфікацыю, але і атрымаць уяўленне аб дасягненнях галіновай навукі, абмяняцца вопытам і найбольш эфектыўнымі практыкамі з калегамі з іншых краін, ініцыяваць сумесныя праекты. Студэнты маюць магчымасць праслухаць курс відэалекцый па навуках аб Зямлі, сустрэцца з мэтрамі геалогіі з Расіі, блізкага і далёкага замежжа. Карыснымі будуць класы Карпінскага і для падлеткаў, якія толькі мараць звязаць свой лёс з гэтай прафесіяй, бо тут можна даведацца аб сучасных метадах пошукавых работ, картаграфіі, даследаванні нетраў і інш.

**Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктар ГАЛАНАЎ** выказаў упэўненасць, што на базе класа Карпінскага будуць узаемадзейнічаць не толькі профільныя спецыялісты. «Гэта пляцоўка для працы і атрымання дадатковых ведаў аб Зямлі, а таксама ўзаемадзеяння нашай моладзі і аксакалаў у галіне геалогіі. Гэта трэба не проста падтрымліваць, а развіваць, таму што толькі пераемнасць традыцый можа даць задзел для будучых вынікаў у геалагічнай галіне», — адзначыў намеснік міністра.

**Александрына ПАРШЫНА.**

**БЕЛАРУСБАНК**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества –

**ОАО «АСБ Беларусбанк» (Гомельское областное управление № 300)**

**ЛОТ 1:** наименование объекта продажи – капитальное строение с инвентарным номером 343/С-77969 общей площадью 29,3 м², 1994 года постройки, расположенное по ул. Карла Маркса, д. 4 В, в г. Хойники.

Начальная цена продажи составляет 4 800,00 белорусских рублей (четыре тысячи восемьсот белорусских рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 800,00 белорусских рублей (восемьсот белорусских рублей 00 копеек).

Сумма задатка – 1 000,00 белорусских рублей (одна тысяча белорусских рублей 00 копеек).

Имущество, относящееся к объекту недвижимости, отсутствует.

**ЛОТ 2:** наименование объекта продажи – изолированное помещение с инвентарным номером 343/D-32983 общей площадью 89,7 м², 1991 года постройки, расположенное по ул. Октябрьская, д. 25А-2 в г. п. Брагин.

Начальная цена продажи составляет 8 400,00 белорусских рублей (восемь тысяч четыреста белорусских рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 1 400,00 белорусских рублей (одна тысяча четыреста белорусских рублей 00 копеек).

Сумма задатка – 1 000,00 белорусских рублей (одна тысяча белорусских рублей 00 копеек).

Имущество, относящееся к объекту недвижимости, отсутствует.

**Открытый аукцион состоится 20.01.2026 в 11.00 часов по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, актовый зал (помещение на четвертом этаже).**

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 16.30, в пятницу – до 15.30 по 19.01.2026 включительно по следующим адресам:
г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а (каб. 113);
г. Хойники, ул. Карла Маркса, д. 4 (ЦБУ № 326);
г. п. Брагин, ул. Октябрьская, д. 25 (ЦБУ № 306).

По вопросам, связанным с объектами продажи, обращаться по телефонам: (0232) 50-92-25, (8029) 180-88-05 – Ладыженко Светлана Станиславовна.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается с ОАО «АСБ Беларусбанк» и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка **по 19.01.2026 включительно** на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию;

иностранным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического или физического лица – доверенность (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель). Доверенность от имени нерезидента Республики Беларусь должна быть легализована в установленном законодательством порядке, перевод на белорусский или русский язык нотариально заверен.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий полномочия (приказ о назначении на должность, или выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены с учетом НДС. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи и документацией на объекты.

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) извещает о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже транспортных средств, бывших в употреблении (местонахождение: г. Минск, ул. Платонова, 22а, ул. Социалистическая, 26/13).
**Продавец имущества: УП «БЕЛТЕХОСМОТР».**
**Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка»,**
г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1 **(www.ipmtorgi.by)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| **1** | Легковой внедорожник универсал HAVAL F7, 9559 TI-7, 2020 г. в. | 48 000,00 |
| **2** | Легковой внедорожник универсал GEELY ATLAS, 0304 CA-7, 2018 г. в. | 45 600,00 |
| **3** | Грузопассажирский универсал «Фольксваген Кэдди», AE 5727-7, 2008 г. в. | 18 000,00 |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 13.01.2026. Дата и время окончания приема заявок:** по **12.01.2026** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | | |
| Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Государственного комитета по имуществу и Минского облисполкома | | |

БАЦЬКОЎСКІ ЧАТ

# ДАСТУКАЦЦА ДА СЭРЦА ДЗІЦЯЦІ

## Што раяць псіхолагі бацькам?

**Любоў — базавая дзіцячая патрэба. Яна настолькі ж неабходна для правільнага развіцця юнага чалавека, як, напрыклад, збалансаванае харчаванне. Але парадокс у тым, што многія бацькі, якія шчыра любяць сваё дзіця, аказваюцца няздольныя данесці гэта пачуццё да дзіцяці.**
**Наступствы такога «эмацыянальнага непаразумення» могуць быць разбуральныя: няўпэўненасць у сабе, трывожнасць, цяжкасці ў пабудове адносін, недавер да свету. Як жа зрабіць так, каб ваша дзіця адчула сябе важным, цэнным і любімым?**

Эмацыянальная сувязь з бацькамі — адзін з ключавых фактараў здаровага развіцця дзіцячай псіхікі. Дзіця не проста хоча адчуваць сябе каханым, яно мае патрэбу ў любові штодня, як у пацвярджэнні сваёй каштоўнасці і бяспекі існавання ў гэтым свеце.

На гэты конт у псіхолагаў ёсць канцэпцыя «Пяць моў любові». Сутнасць яе ў тым, што кожны чалавек (і дзіця — не выключэнне) здольны ўспрыняць любоў толькі пэўным спосабам. Праблемы ў адносінах з дзецьмі ўзнікаюць менавіта ў той момант, калі бацькі выказваюць любоў на «сваёй» мове, у той час як сын ці дачка «гаворыць» на іншай. Такім чынам, задача мам і тат «перавесці» сваё пасланне клопату на тую мову, якая будзе зразумелая дзіцяці.



### ЯК ГЭТА ЗРАБІЦЬ?

**Словы падтрымкі.** Пахвала павінна быць канкрэтнай і факусіравацца на намаганнях, а не толькі на выніку або прыроджаных якасцях. Замест «Ты разумны» скажыце: «Мне вельмі спадабалася, як ты знайшоў рашэнне гэтай задачы, да таго ж ты праявіў настойлівасць». Замест «Добры малюнак» — «Ты так старанна падабраў колеры, і дэталі прамаляваныя акуратна!»

Даследаванні паказваюць, што менавіта такая пахвала фарміруе ў дзіцяці жаданне развівацца, матывуе да пераадолення цяжкасцяў і ўмацоўвае веру ў свае сілы. Пустыя, няшчырыя кампліменты ці пахвала толькі за вынік могуць прывесці да залежнасці ад знешніх ацэнак і страху няўдачы.

Ключавое правіла — шчырасць і канкрэтыка. І ніколі не хваліце дзіця ў дрэнным настроі — фальш дзеці заўсёды адчуваюць інтуітыўна.

**Пяшчота і прызнанне.** «Я цябе люблю», «Я так рады(а), што ты ў мяне ёсць», «Мне падабаецца праводзіць з табой час» — гэтыя фразы павінны гучаць рэгулярна, без прывязкі да дасягненняў. Яны фарміруюць пачуццё безумоўнага прыняцця.

**Побач у цяжкую хвіліну.** «Я бачу, табе складана, але я веру, што ты справішся», «Я побач, калі спатрэбіцца дапамога», «Паплач, гэта нармальна». Такія фразы вучаць дзіця рэгуляцыі эмоцый і даюць адчуванне надзейнага тылу.

**Якасны час.** Тут галоўнае — глыбокая ўцягнутасць у зносіны. Гаворка не пра колькасць гадзін, праведзеных разам з дзіцем, а пра якасць прысутнасці. Гэта час, калі вы цалкам «тут і цяпер»: адклалі тэлефон, выключылі ўнутраны дыялог аб рабоце, глядзіце ў вочы, актыўна слухаеце і ўдзельнічаеце.

**Сумесныя рытуалы.** Гэта не толькі забаўкі, але і будні, праведзеныя разам. Падрыхтоўка вячэры (нават калі дзіця маленькае і толькі дапамагае вам мыць агародніну), сумесная прыборка (ператвораная ў гульню), паход у краму з абмеркаваннем выбару прадуктаў, прагулка без гаджэтаў з гутаркамі «пра жыццё», сямейнае чытанне з абмеркаваннем. Гуляйце з сынам або дачкой па іх правілах, глядзіце іх любімыя мультфільмы і абмяркоўвайце ўражанні, цікаўцеся іх захапленнямі (нават калі гэта здаецца вам нецікавым). Фізічная прысутнасць пры ментальнай адхіленасці («Я ж побач сяджу!») горш, чым адкрытая адсутнасць. Гэта спараджае пачуццё «адзіноты ў натоўпе». Памятайце: дзіця можа стаць агрэсіўным ці капрызным менавіта ад дэфіцыту сапраўднай увагі. Часам адна гадзіна шчырых зносін каштоўней ідэальна прыбранага дома.

**Знакі ўвагі.** Падарунак — гэта матэрыяльны сімвал любові, ён быццам кажа: «Я думаў(ла) пра цябе», «Я ведаю, што табе падабаецца». Важна, каб падарунак адлюстроўваў інтарэсы дзіцяці, а не ўяўленні бацькоў аб «правільных» цацках або іх уласныя нерэалізаваныя мары. Нечаканы маленькі падарунак (ласунак, каменьчык незвычайнай формы, налепка з любімым героем) без нагоды — магутны сігнал: «Ты важны для мяне заўсёды, а не толькі ў дні нараджэння». Але тут могуць узнікнуць небяспекі, напрыклад, падмена любові і ўвагі падарункамі.

Даследаванні паказваюць, што «рэчызм» у дзяцей часта развіваецца як кампенсацыя эмацыянальнай пустаты, недахопу цяпла і часу з боку бацькоў. Ніякі, нават самы дарагі падарунак, не заменіць абдымкаў, размовы па душах ці сумеснай гульні. Або «ўмоўныя падарункі» («Атрымаеш дзясятку — куплю планшэт», «Прыбярэш пакой — дам цукерку»). Яны фарміруюць рынкавыя адносіны («Ты — мне, я — табе»), забіваюць унутраную матывацыю і вучаць дзіця разлічваць на ўзнагароду за свае добрыя паводзіны. Любоў не павінна быць валютай.

**Тактыльны кантакт.** Абдымкі, пацалункі, пагладжванні па спіне, трыманне за руку — гэта не проста прыемна, гэта фізіялагічная неабходнасць. Рэгулярны пазітыўны тактыльны кантакт у дзяцінстве стымулюе выпрацоўку аксітацыну, гармону любові і прыхільнасці, і зніжае ўзровень картызолу, гармону стрэсу, а таксама спрыяе выпрацоўцы гармону росту (дзеці, пазбаўленыя ласкі, часта маюць затрымку фізічнага развіцця — феномен «псіхасацыяльнай нізкарослasці») і ўмацоўвае імунную сістэму.

Але, разам з тым, важна чытаць сігналы дзіцяці. Калі яно адхіляецца, не настойвайце. Прапануйце кантакт ненадакучліва («Абдымемся?»). Павага да яго рамак — таксама праява любові.

### «ЦЯЖКАСЦІ ПЕРАКЛАДУ»

Як даведацца пра вядучую мову любові вашага дзіцяці? Станьце гледачом і слухачом. Назірайце, як дзіця паказвае сваю любоў да вас і іншых — яно выкарыстоўвае сваю ўпадабаную мову. Калі ён увесь час абдымае вас, малюе вам паштоўкі, просіць пагуляць ці кажа ласкавыя словы — гэта ключ.

На што ён найчасцей скардзіцца? Гэта паказвае на незадаволенае запатрабаванне ў любові: «Ты са мной ніколі не гуляеш!» (недахоп сумесна праведзенага часу), «Ты мяне зусім не кахаеш!» (абагульненне дэфіцыту). Аднак будзьце асцярожныя, гэта можа быць і маніпуляцыя! «Адыдзі, не чапай мяне!» (можа быць прыкметай патрэбнасці ў дотыку, калі сказана ў кантэксце крыўды).

Што выклікае шчырую радасць? Захапленне ад сумеснага паходу ў парк? Ад нечакана набытай цацкі? Ад сказанай вамі фразы «Я табой ганаруся!»? Ад доўгіх абдымкаў пасля сваркі? Эксперыментуйце: выкарыстоўвайце розныя мовы на працягу тыдня і назірайце за рэакцыяй.

### ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ ЗАЎСЁДЫ

Самае галоўнае, што павінна зразумець дзіця: ваша любоў да яго не залежыць ад яго поспехаў, паводзін ці вашага настрою. Гэта безумоўная любоў, яна не азначае ўсёдазволенасць, яна азначае: «Я люблю цябе заўсёды, нават калі злуюся на твой учынак».

Паслядоўнасць у праявах любові (асабліва на мове дзіцяці) стварае для яго прадказальны, бяспечны свет.

**Псіхолаг Алена ШАЎЧЭНКА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Старица-Агро»** (продавец)
проводит открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества:

**Лот № 1:**
**одним лотом недвижимое имущество в составе:**

- **здание склада материалов с инв. № 642/С-25045 общ. пл. 431,5 кв. м, адрес: Минская обл., Копыльский р-н, Грозовский с/с, 4/5, вблизи д. Грозовок;**
- **здание котельной с инв. № 642/С-25046 общ. пл. 126,3 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка), адрес: Минская обл., Копыльский р-н, Грозовский с/с, 4/4, вблизи д. Грозовок;**
- **здание главного корпуса с инв. № 642/С-25047 общ. пл. 702,7 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка, подвал), адрес: Минская обл., Копыльский р-н, Грозовский с/с, 4/3, вблизи д. Грозовок;**
- **подсобное помещение с инв. № 642/С-42423 общ. пл. 71,1 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка), адрес: Минская обл., Копыльский р-н, Грозовский с/с, 4/1, вблизи д. Грозовок (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 622800000001001644 (право постоянного пользования) площадью 4,9262 га по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Грозовский с/с, вблизи д. Грозовок.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона рек и водоемов (2,9990 га и 1,5287 га), охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000В (0,3443 га).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 184 345,66** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 18 434,00** бел. руб.

**Лот № 2: складское помещение с инв. № 642/С-42424 общ. пл. 229,8 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622882500001000052 (право аренды по 13.02.2043) площадью 0,1870 га, по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Грозовский с/с, 4А, вблизи д. Грозовок.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона рек и водоемов (0,1834 га), охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000В (0,0096 га).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 29 595,14** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 2 959,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **12.01.2026** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.01.2026** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (801719) 4-18-33, (8029) 130-06-03.**

УНП 690301954



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 111/D-5676 (наименование: Квартира № 1 в блокированном жилом доме; назначение: Квартира) площадью 102,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новосёлковский с/с, д. Титковщина, ул. Центральная, 18-1 | 3 600,00 | 360,00 |
| **Лот № 2:** изолированное помещение с инвентарным номером 111/D-5677 (наименование: Квартира № 2 в блокированном жилом доме; назначение: Квартира) площадью 79,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новосёлковский с/с, д. Титковщина, ул. Центральная, 18-2 | 2 920,00 | 292,00 |

**Продавец:** ОАО «Путь новый», Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Новосёлки, ул. Центральная, 14, тел./факс 801633 3 17 32. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел. 80162 40 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** оплата Объекта в день заключения договора. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 24 декабря 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 декабря 2025 г. до 17.00**

# ПАСТКА Ў МЕСЕНДЖАРЫ

## Як ашуканцы выкарыстоўваюць пераднавагодні пакупніцкі ажыятаж



Снежань традыцыйна становіцца часам, калі зламыснікі выдаюць сябе за крамы навагодняй атрыбутыкі. Ашуканцы выкарыстоўваюць пераднавагодні ажыятаж для сваёй злачыннай дзейнасці, паведамілі ў МУС Беларусі.

### НА ШТО ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ?

Спецыялісты ведамства расказалі, што напярэдадні навагодніх свят актывізуюцца аферысты, якія публікуюць аб'явы аб продажы ёлак, упрыгажэнняў і рознага кшталту навагодніх падарункаў. Галоўная фішка такіх уяўных крам — поўная або частковая перадаплата. Калі пакупнік згаджаецца менавіта на такі спосаб аплаты, то пасля ўключаецца рэжым ажыятажнай даверлівасці. У гэты час спажывец чакае свой заказ на працягу некалькіх дзён, думаючы, што той затрымліваецца, але праз пэўны час разумее, што прадавец больш не выходзіць на сувязь. Толькі потым пакупнік звяртаецца ў міліцыю. За гэты час грошы пацярпелага ўжо сыходзяць на замежны рахунак зламыснікаў.

Праваахоўнікі адзначылі, што пазіцыяванне ў сацсетцы якога-небудзь акаўнта, які прадстаўляе інтарэсы інтэрнэт-крамы, не гарантуе, што гэта сапраўды так. Уважліваму пакупніку неабходна звяртаць увагу на некаторыя дэталі, без якіх рэальны гандлёвы аб'ект не функцыянуе. Гэта зразумелае месцазнаходжанне крамы, наяўнасць уліковага нумара падаткаплацельшчыка, найменне юрыдычнай асобы. Добра будзе праверыць таксама ўказаны нумар тэлефона. Уступаючы ў кантакт з прадстаўнікамі такіх крам, заўсёды лепш патрабаваць ад іх сувязі не толькі ў месенджары.

### СТАЛА ВЯДОМА

**ПАШТОЎКІ З ВІРУСАМІ**

Ашуканцы масава рассылаюць навагоднія паштоўкі з вірусамі. Спецыялісты рэкамендуюць не адкрываць замаскіраваныя пад карцінкі GIF-анімацыі або відэафайлы з расшырэннем .apk, атрыманыя ад незнаёмцаў, інакш можна страціць усе грошы на рахунках і асабістыя даныя. Калі паштоўка прыйшла ад знаёмага, спытайце, ці дакладна ён яе адпраўляў.

### У ПАГОНІ ЗА «ЭКСКЛЮЗІЎНАЙ ЗНІЖКАЙ»

Прэс-служба УУС Мінскага аблвыканкама звяртае ўвагу на тое, што злачынцы па-ранейшаму выкарыстоўваюць даволі простую схему. У сацыяльных сетках з'яўляюцца яркія рэкламныя публікацыі з прывабнымі прапановамі. Карыстальніку пішуць у асабістыя паведамленні, дзе «менеджар» настойліва пераконвае аформіць заказ і ўнесці перадаплату. Для большай пераканаўчасці ашуканцы нярэдка прыкрываюцца назвай транспартнай кампаніі, абяцаючы хуткую дастаўку. Псіхалагічны ціск робіцца на стварэнні адчування тэрміновасці. Кліенту паведамляюць, што тавар застаўся ў адзіным экземпляры, прапануюць «эксклюзіўную зніжку» або абмяжоўваюць час дзеяння акцыі.

У выніку чалавек пагаджаецца пераверсці грошы, часта на банкаўскую картку, а пасля гэтага сувязь з прадаўцом абрываецца. Натуральна, ніякі тавар пакупніку не адпраўляюць. Праваахоўнікі нагадваюць: каб не стаць ахвярай падобных схем, неабходна праяўляць асцярожнасць. Сапраўдныя інтэрнэт-крамы працуюць праз афіцыйныя сайты, дзе заказ афармляецца праз «кошык», а не ў перапісцы ў месенджарах. Аплата «на картку» ці нават праз сістэму АРІП па асабістых рэквізітах — відавочны сігнал, што перад вамі ашуканцы.

### АПЛАТА — ПА ФАКЦЕ

Між тым аўтаматызаванай сістэмай Нацыянальнага банка краіны з пачатку верасня зафіксаваны ўжо сотні выпадкаў «продажу неіснуючых навагодніх тавараў». Аб гэтым паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе фінансавага рэгулятара краіны.

Ашуканцы ў сацсетках размяшчаюць аб'явы аб продажы навагодніх тавараў па прывабных цэнах. Узамен на 100-працэнтную перадаплату прадавец абяцае добрую зніжку або бясплатную дастаўку. Пасля аплаты прадстаўнік крамы перастае выходзіць на сувязь, старонкі ў сацыяльных сетках знікаюць, а тавар так і не прыходзіць.

Каб не трапіць на вуду прайдзісветам пры здзяйсненні пакупак у сетках, фінансавыя эксперты прапануюць аддаваць перавагу аплаце па факце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ АДПАЧЫНКУ

**Колькі беларусы страцілі на набыцці тэрміновых тураў у ашуканцаў, расказалі ў Нацбанку**

**Аўтаматызаванай сістэмай Нацбанка з 1 верасня зафіксаваны 191 выпадак махлярства пры афармленні віз або куплі тэрміновых тураў. Агульная сума шкоды — 188 тысяч рублёў, паведамілі БелТА ў прэс-службе банка.**

У Нацбанку падзяліліся падрабязнасцямі схемы: ашуканцы ў сацыяльных сетках размяшчаюць прывабныя прапановы па афармленні віз або продажы тэрміновых тураў за мяжу. Пад выглядам менеджара або агента з кліентам звязваецца зламыснік і пераконвае пад рознымі падставамі ўнесці перадаплату (аплаціць візавы збор, страхоўку, білеты і г. д.). Пасля аплаты «прадстаўнік кампаніі» перастае выходзіць на сувязь, а візу або пуцёўку ахвяра так і не атрымлівае.

Каб не трапіць на гэту вуду, рэкамендуецца старанна правяраць тураператара або візавае агенцтва пры звароце. Неабходна пераканацца ў наяўнасці фізічнага офіса арганізацыі. Акрамя гэтага, нельга пераводзіць грошы на банкаўскую картку фізасобы або на чужы крыптакашалёк.


## ОЗЕРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

сообщает о проведении **14 января 2026 г.** по адресу: агрогородок Озеро, улица Дзержинская, 27б в 10.00 открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| ЛОТ № | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Жасминовая, участок № 46, кадастровый номер 625682508601001035 | 0,1343 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги. Подлежат возмещению затраты на инфраструктуру | 50 000.00 | 2 545.56 + публикация в газете | 5 000.00 |
| 2 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Светлая, участок № 11, кадастровый номер 625682504101000083 | 0,1234 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 25 000.00 | 2 268.30 + публикация в газете | 2 500.00 |
| 3 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Полевая, участок № 13, кадастровый номер 625682504101000079 | 0,1178 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 25 000.00 | 2 100.60 + публикация в газете | 2 500.00 |
| 4 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Полевая, участок № 14, кадастровый номер 625682504101000080 | 0,1199 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги | 25 000.00 | 2 061.49 + публикация в газете | 2 500.00 |
| 5 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 14А, кадастровый номер 625682501601000035 | 0,1665 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги, до асфальта – 0,2 км | 25 000.00 | 2 663.08 + публикация в газете | 2 500.00 |
| 6 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 21, кадастровый номер 625682501601000034 | 0,1875 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги, до асфальта – 0,1 км | 28 500.00 | 2 625.61 + публикация в газете | 2 850.00 |
| 7 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 27, кадастровый номер 625682501601000037 | 0,1565 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги, до асфальта – 0,2 км | 32 000.00 | 3 139.37 + публикация в газете | 3 200.00 |
| 8 | Минская область, Узденский район, деревня Боханы, улица Центральная, участок № 28, кадастровый номер 625682501601000036 | 0,1504 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги, до асфальта – 0,2 км | 32 000.00 | 2 962.01+ публикация в газете | 3 200.00 |
| 9 | Минская область, Узденский район, деревня Суковцы, улица Центральная, участок № 14, кадастровый номер 625682501601000081 | 0,2514 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с гравийной дороги, до асфальта – 80 м | 28 500.00 | 2 668.71+ публикация в газете | 2 850.00 |
| 10 | Минская область, Узденский район, деревня Застаринье, улица Центральная, участок № 1В, кадастровый номер 625682505101000037 | 0,100 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги | 15 000.00 | 3 433.47+ публикация в газете | 1 500.00 |

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY97AKBB36410625001436000000 в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, БИК AKBBBY2X, УНП 600110154, код назначения платежа – 40901 (перечисление гарантийного взноса). Получатель – Озерский сельский исполнительный комитет.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по рабочим дням с 8.00 – 13.00 с 14.00-17.00 по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Озеро, ул. Дзержинская, 27б. Последний день приема заявлений – **09 января 2026 г. до 17.00.** Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны предоставить следующие документы:

1) заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

3) копию документа, содержащего его идентификационные сведения (ксерокопию паспорта);

4) представителям гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, предоставляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукционов и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно получить по телефонам: **(801718) 65 382, 49 347; +375295659160.**

# ЖЫЦЦЁ ЗАНАДТА КАРОТКАЕ,
## КАБ ТРАЦІЦЬ ЯГО НА ДРОБЯЗІ

**Парады бывалых: пі болей, чым хочацца, еш меней, чым хочацца, спі ўволю: столькі, колькі хочацца.**

**Лёгка гэта сказаць...**

**Не, з вадой яшчэ і зрабіць можна: дзе быўшы, узяў ды кубачак выпіў.**

**З ежай складаней, бо цяжка спыніцца, калі яе шмат — рознай і смачнай, калі ў добрай кампаніі.**

**А найгорай — са сном: калі ён тут і звальвае з ног — бракуе часу, калі ёсць час — хоць вочы зашывай — бракуе сну.**

**...Кажуць, асабісты рэкорд па яго працягласці паставіла студэнтка Сідарава: заснуўшы на лекцыі па гісторыі, яна праспала з XVII стагоддзя да XX. Магчыма, у запас?**

## ТРЭЦІ... НЕ ЛІШНІ!

Жыллё ў тыя часы не куплялася і не прадавалася, але дзве маленькія кватэры па два пакоі каляжанка памяняла на адну ажно з... пяццю.

Планіроўка была цікавая: з парога — у прасторную вітальню, а ўжо адтуль — у пакоі па баках.

Найбольшы гаспадыня (яна ж галава сям'і) адвяла для старэнькіх мужавых бацькоў, два невялічкія — для амаль дарослых сына і дачкі, яшчэ два — пад спальню і кабінет.

Нешта падобнае цяпер у нашай цырульні: толькі ў «вітальні» — працоўнае месца адміністратара, вялізны экран тэлевізара, утульныя крэслы.

На іх у чаканні сваёй чаргі — калі яна ёсць — бавяць час кліенты. Калі няма — хто-ніхто з майстрых: з манікюрнай залы, з жаночай...

У той раз цырульніца з мужчынскай правяла свайго кліента да стала адміністратара, пачакала, пакуль ён разлічыцца, нацягне шапку на стрыжку пад Катоўскага, сыдзе, а ўжо потым заклапочана ўздыхнула:

— Фу-у... Трэці лысы за раніцу!

...Холадна, але ж, мусіць, модна?

## НЕ Ў БРЫВО...

Беларуская прымаўка: «Лёгкае пёрка, а на дах не закінеш».

Гэта — калі адно і «голае». А вось у нейкім выраБе — хоць за тысячы вёрст: тыя ж пухавікі, згадзіцеся, ці не ў кожнай шафе цяпер, бо зручная вопратка: лёгкая, цёплая, ноская.

Пёркі, праўда, з часам вылазяць, пачынаюць бялець на адзенні — у самых нечаканых месцах.

Якраз пра гэта — грузінская прымаўка: «Пер'е, што выпадкова прыстала да пятай кропкі, анікога яшчэ арлом не зрабіла».

## ВЕК ЖЫВІ — ВЕК ВУЧЫСЯ?

Як ёсць — так ёсць: з кожным годам усё лепшыя тэлевізары, усё горшая якасць перадач, але...

Знаёмае дзяўчо спіць і бачыць сябе актрысай — на вялікай сцэне, на малым экране. Дзеля гэтага яно (і каторы ўжо год!) «не есць-не спіць»: займаецца спортам, музыкай, танцамі, сочыць за фігурай, носіць брэкеты, гадуе косы, трэніруе памяць (завучвае байкі, вершы, урыўкі з прозы), шмат чытае, ходзіць у кіно і на курсы... Ну, зусім не шкадуе сябе!

І таму, як выглядае, спраўдзіць мару — стане-такі артысткай: будзе служыць у тэатры, здымацца ў кіно...

А значыць, вучыцца далей: страляць, курыць, душыць, выпіваць, «раздзявацца»...

З назіранняў бывалых: гэта няпраўда, што ранейшыя, старыя кінафільмы прымушалі гледачоў задумвацца, а новыя — ужо не...

Яны таксама прымушаюць, паглядзеўшы, падумаць: а навошта было глядзець?



Валянцін Губараў «Супрацьстаянне».

## ПАЙСЦІ... КАБ ВЯРНУЦЦА?

Выходзячы замуж за артыста — маладога, прыгожага, таленавітага, — дзяўчына, пэўна ж, разумела, што вернасці ды пастаянства з яго боку чакаць не даводзіцца.

Так яно і атрымалася: даймалі фанаткі, даходзілі чуткі. А потым — не толькі яны. Муж сам адкрытым тэкстам сказаў, што кахае іншую, што сыходзіць, і стаў збіраць свае рэчы.

Як ні дзіўна, жонка ў гэты час (двое малых) не крычала і не плакала. Хіба на развітанне, каля парога, тулячы дзяцей, сказала:

— Ведай, што мы цябе вельмі любім і будзем чакаць.

Праз тыдзень-другі муж не вытрымаў: з тым самым чамаданам вярнуўся дамоў, каб ніколі больш не сыходзіць, не здраджваць сваім.

...Паданне свежае ды веры штось няма. Бо цяпер, як выглядае, ніхто з так званых персон (і вядомых, і нават малавядомых) па-людску ўжо не сыходзіць: пачынаюцца суды і перасуды, дзеляцца дамы і дзеці, падпальваюцца — гараць масты, «асвятляючы» дарогу наперад, бо назад яе ўжо няма.

## БЫЛО... НЕ БЫЛО!

Класіка:

*«Ідзе той дзядзька і па бруку*

*Адзін за дзесяць робіць груку...»*

Мы, цёткі, рабілі, мусіць, за сорак, бо ўдзвюх на абцасах, даганяючы трамвай...

Факт, што двое мужчын, пачуўшы грукат за спінамі, расступіліся — прапусцілі наперад.

Мы, пралятаючы міма, ледзь паспелі сказаць ім «дзякуй», убачыць, што гэта... негры і пачуць ад іх: «Калі ласка».

Словам, было з чаго пасмяяцца, уляцеўшы ў трамвай.

А потым, адсмяяўшыся, зразумець, што ўсё ж... не было, бо ад людзей тутэйшых — колькі ні «дзякуй» — тое ж «калі ласка» амаль не пачуеш.

## СУПРАЦЬ ЛОМА?

Сталіца, праспект, даўжэзны дом, на першым паверсе — такая ж крама, і ўсё ў ёй — як мае быць (на першы погляд): безліч тавараў, аддзелаў...

У патрэбным — пуста: пакупнікоў няма.

— Калі ласка, — прасім прадаўшчыцу, — пакажыце масажную шчотку.

— *Это какую?* — удакладняе тая.

— З драўлянай ручкай. На другой паліцчы...

— *Где-где?!* — наморшчвае лоб жанчына і тут жа зрываецца на крык. — *Вы что — по-человечески, как нормальные люди, спросить не можете?!*

— ?!

...З назіранняў бывалых: калі ты спрачаешся з дурнем, значыць, дурных ужо двое.

Для таго каб не спрачацца, адна сваячка ў падобных выпадках пераходзіць на англійскую мову, другая не грэбуе матам. Кажа, што з яго дапамогай сёння хутчэй даходзіць.

Крый бог, калі-небудзь паспрабаваць.

## ХТО РАНА ЎСТАЕ, ТОЙ... УСІХ ДАСТАЕ

Раніца. Горад. Дом як мурашнік.

У некага з жыльцоў (у каго?.. знізу, зверху, збоку?) сёння, падобна, госці. І таму а пачатку сёмай гаспадар (гаспадыня?) пачынае адбіваць мяса і... мазгі суседзям. Прачнуўшыся пад кароткае, метадычнае бух-бух-бух, яны — кожны паасобку — напэўна ж, думаюць: ну што за сцэны?! (І што за людзі?!) Напэўна ж, наракаюць, праклінаюць, чакаюць, калі ўсё скончыцца... Зрабіць нічога не могуць, бо горад не вёска, бо дом — як мурашнік: у каго сёння свята, хіба разбярэш?

...З думак у суцяшэнне: я ўжо даўно не мару прачнуцца багатым і знакамітым. Мару проста прачнуцца. Для таго каб жыць — сёння і колькі Бог дасць — з любоўю да блізкіх, з разуменнем (па магчымасці) да далёкіх, са спагадай да тых, хто не мае рацыі, і з верай у тое, што ўсё здараецца не выпадкова.

*Жыццё занадта кароткае, каб траціць яго на дробязі.*

**Валянціна ДОЎНАР.**


### Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:**

1) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-6648 (наименование: аптека № 60; назначение: здание специализированное здравоохранения и (или) предоставления социальных услуг), площадью 115,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новоселковский с/с, д. Божки, ул. Кирова, 39, на земельном участке с кадастровым номером 125083608601000121, площадью 0,0916 га, составные части и принадлежности: одноэтажное деревянное, облицованное кирпичом здание аптеки с одной кирпичной пристройкой, одной верандой, нормируемой площадью 93,7 кв. м, с одной дощатой уборной, дощатым забором;

2) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-6649 (наименование: сарай; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 28,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новоселковский с/с, д. Божки, ул. Кирова, 39/1, на земельном участке с кадастровым номером 125083608601000121, площадью 0,0916 га, составные части и принадлежности: одноэтажный блочный сарай

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 1 360,40 | Размер задатка, руб. | 136,04 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Путь новый», 225374, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Новоселки, ул. Центральная, 14, тел./факс 80163331732. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** в безналичной форме платежными поручениями в течение 10 календарных дней с момента государственной регистрации договора купли-продажи недвижимого имущества. **Срок передачи недвижимого имущества:** по акту приема-передачи в течение 5 рабочих дней с момента поступления все стоимости недвижимого имущества на расчетный счет ОАО «Путь новый». **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 24 декабря 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 декабря 2025 г. до 17.00**



### УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ГИПРОСВЯЗЬ»!

**Сообщаем о проведении ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

Собрание состоится **22 декабря 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, конференц-зал

Регистрация участников – **с 9.00 до 9.40.** Начало проведения собрания: **10.00**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** О создании коммерческой организации в форме общества с ограниченной ответственностью.
**2.** Об определении состава учредителей создаваемого общества с ограниченной ответственностью.
**3.** Об определении размера вклада, подлежащего внесению ОАО «Гипросвязь» в уставный фонд создаваемого общества с ограниченной ответственностью, и размере доли ОАО «Гипросвязь».
**4.** Об определении ответственного лица за осуществление действий, связанных с созданием общества с ограниченной ответственностью, и наделение его соответствующими полномочиями.
**5.** О внесении изменений в устав ОАО «Гипросвязь».

Время и место ознакомления акционеров со следующей информацией:

требование Министерства связи и информатизации Республики Беларусь о проведении внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гипросвязь» с предложениями о включении вопросов в повестку дня внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гипросвязь» от 5 декабря 2025 г. № 14-14/6977 – с 12 по 19 декабря 2025 года по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, каб. 221 в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 16.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

- акционеру Общества – документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера – документ, удостоверяющий личность и оригинал доверенности, который должен быть передан лицу, определенному руководителем ОАО «Гипросвязь» для выполнения этих функций.

Список акционеров ОАО «Гипросвязь», имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 18 декабря 2025 года.

С протоколом внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гипросвязь» можно ознакомиться в каб. 221 в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 16.00.

УНП 100230534

*Наблюдательный совет*

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Архіў. Асака. Клім. Ірбіс. Каптур. Дошка. Трапак. Алея. Газа. Аксакаў. Кат. Маяк. Апора. Акр. Лат. Маёр. Атака. **Па вертыкалі:** Трэск. Біткі. Альт. Амур. Бішкек. Скат. Прага. Указ. Два. Паўкола. Кантата. Лапата. Ясакар. Клара. Арак.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*





Фота БелТА.

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## ВАСА — ГЭТА НЕ ЛЮБОЎ...

**Ціха... Ідуць экзамены...**

**— Можна здаць без залікоўкі? — пытаецца студэнт.**

**— Нельга, — кажу. — Учора на кансультацыі я ўсіх папярэдзіла.**

**— А я не быў... І не чуў.**

**— Тады выклікайце таксі, едзьце па залікоўку.**

**— Да Мар'інай Горкі далёка.**

**— Значыць, бывайце.**

Я меркавала, што на сёння развітаўся з гэтым студэнтам. Аж не! Хлопец са сваім пытаннем, падобна, схадзіў у дэканат, і таму хвілін праз колькі я ўжо куратару групы па тэлефоне даводзіў (і той згадзіўся), што нельга без залікоўкі прымаць экзамен.

Думаеце, пасля гэтага студэнт здаўся? Я таксама падумаў, а ён узяў ды зноўку з'явіўся — з... дазволам на здачу экзамену ад... прарэктара па навуковай рабоце.

— Ты што, — цікаўлюся ў хлопца, — да рэктарата дайшоў?

Ён — пытаннем на пытанне:

— А чаму б і не?!

Далей усё звычайна: выцягнуў білет, падрыхтаваўся, здаў экзамен. У панядзелак прынёс залікоўку. «Малайчына!» — больш, здаецца, нічога не скажаш! Хіба дзякуй бацькам, якія навучылі сына не губляцца ў складаных абставінах, шукаць і знаходзіць выйсце. Мяне ў жыцці гэта вельмі выручала.

Малы, помню, плаваць не ўмеў, а мае равеснікі ў вадзе ўжо сталі. Зайздросціў — страшна! А неяк узяў ды асмеліўся: з мелкаводдзя зайшоў на глыбіню, падскочыў, узняў рукі і... тут жа пайшоў на дно. Спалохаўся, хлебануў вады, але ж сцяміў, што здавацца нельга: перабіраючы рукаміногамі, выбраўся наверх — выжыў!

Гэта быў не першы такі выпадак. І не апошні.

Пасля вайны нідзе, напэўна, не засталося ніякіх клубаў, а тым болей — дамоў культуры. На вячоркі людзі збіраліся ў ацалелых хатах: дарослыя з усёй акругі — у адной, падшыванцы ды малыя — у другой. Іх «зборкі» называліся «шалманамі», але ўсё там было па-даросламу: танцы, песні, карагоды і, чамусьці, — бойкі.

Пачатак чарговай: у хату падчас «шалману» ўлятае Міша Лабоха, крычыць: «Мальцы, на нас ідуць хацццяўляне, ломім платы, хапаем палкі!» Мы — лёцьма на вуліцу. Там — цёмна, але ж я бачу, што на мяне нясецца нейкі бамбіза... Бягу насустрач, згінаюся, б'юся галавой яму ў жывот і... перакідваю цераз сябе. Ніколі б не падумаў, што змагу такое зрабіць, прычым лёгка!

Яшчэ адзін эпізод: пасля вайны ў вёсках, можна сказаць, ні мужчын, ні коней: каб прывезці дроў ці абагнаць бульбу, трэба было добра ўгадзіць брыгадзіру. Неяк нам з мамай (тата загінуў) ён зрабіў найвялікшую ласку — дазволіў узяць каня. Я забраў яго ў іншай вёсцы. Шлях дадому ляжаў праз ладную балаціну.

Конік пад'ехаў да яе і ледзь не адразу... праваліўся ў багну — толькі галава тырчыць. Я кідаюся следам, выпрагаю каня. Той, ледзь не падмяўшы мяне пад сябе, выскаквае з багны. Потым — як ні цяжка было — мы разам выцягваем калёсы.

Былі прыгоды і на экзаменах: здаваў, помню, выпускны па рускай літаратуры. У білеце — трагедыя Горкага «Васа Жалязнова», я пра яе — ні сном ні духам... Але ж — эўрыка! — глядзеў фільм пра... Любоў Яравую. Пачаў расказваць — ды з такім запалам...

Мяне спрабавалі спыніць: сказаць, што я пераблытаў, але ж «Астапа ўжо панесла»... «Хоць голы, ды бравы», — усміхнуўся настаўнік Мітрафан Апанасавіч, і экзамен я здаў.

...Сваёй песняй «Надежда» паэт Дабранраваў і кампазітар Пахмутава шмат каму сказалі, што «*надо быть спокойным и упрямым*». Гэта, па-мойму, не найгоршыя якасці? Ці не так?

**І. І. Астроўскі,**
*г. Мінск.*

## 10 СНЕЖНЯ | Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1910** год — нарадзіўся Арсеній Аляксеевіч Нячаеў (в. Блеўчыцы Капыльскага р-на Мінскай вобл.), Герой Савецкага Саюза (1946 г.). У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. ваяваў на Волхаўскім, Ленінградскім і 1-м Беларускім франтах. Удзельнік прарыву блакады Ленінграда, вызвалення Пскоўскай вобласці, Эстоніі, Латвіі, баёў ва Усходняй Прусіі і штурму Берліна.

**1920** год — заснаванне Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (БНТУ). У гэты дзень пачаліся заняткі на механічным, хіміка-тэхналагічным, культурна-тэхнічным, аграналагічным і лясным факультэтах Мінскага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута, які быў створаны на базе Мінскага політэхнічнага вучылішча. Першым дырэктарам (рэктарам) быў прызначаны Ніканор Казіміравіч Ярашэвіч. Выкладчыцкі склад налічваў каля 50 чалавек. У першым навучальным годзе ў Інстытуце вучыліся 305 студэнтаў і 119 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення.

**1945** год — нарадзіўся Валянцін Браніслававіч Шалькевіч (г. Мінск), беларускі вучоны ў галіне неўралогіі і нейрахірургіі, доктар медыцынскіх навук (1989 г.), прафесар (1990 г.). Працаваў у Беларускім НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі. Аўтар навуковых прац па сасудзістай паталогіі галаўнога мозгу. Заснаваў у Беларусі кірунак па вывучэнні і распрацоўцы найбольш эфектыўных метадаў лячэння і дыягностыкі захворванняў нервовай сістэмы з дапамогай гіпер- і гіпабарацэрапіі.

**1945** год — пачаў выпускаць прадукцыю аднаўлены Добрушскі цэлюлозна-папяровы камбінат «Герой працы» (цяпер — Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы»).

У свеце

**1948** год — Генеральная Асамблея ААН прыняла Усеагульную дэкларацыю праў чалавека.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 129. Індэкс 63850. Зак. № 2691.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 снежня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12